...РАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 13-і
№ 2 (1951)
5 студзеня 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

РУКУ НА ДРУЖБУ, 1965-ы!

ВОСЬ і яшчэ адзін год стаў старонкай гісторыі. Яркай, цікавай старонкай велічнай, палымянай гісторыі эпохі будаўніцтва камунізма. Ён яшчэ вельмі блізка ад нас, год 1964-ы, і нам цяжка пакуль дакладна ўзважыць маштабнасць яго падзей, іх значэнне ў ланцугу фактаў, якія будуць вывучацца гісторыкамі-нашчадкамі. Але сэрцамі сваімі, гэтым цудоўным барометрам будучыні, мы прадчуваем, што ў летапіс нашай эпохі год, з якім мы толькі што развіталіся, увойдзе, як год-асілак, год вялікіх, радасных здзяйсненняў.

Гэта быў год, які яшчэ і яшчэ раз праславіў нашу краіну. Трыумфальным палётам касмічнага экіпажу. Новымі захадамі партыі і ўрада па павышэнню жыццёвага ўзроўню народа. Першым магутным фантанам беларускай нафты. Новабудоўлямі, адкрыццямі вучоных, цвёрдай і паслядоўнай абаронай міру.

Гэта быў год выдатных, знамянальных поспехаў савецкай літаратуры і мастацтва. У апошнія дні снежня ў газеце апублікаваны былі спісы мастацкіх твораў, вылучаных на атрыманне Ленінскіх прэмій 1965 года. Мы не ведаем, якія з іх выйдуць пераможцамі ў конкурсе на гэтую вышэйшую ўзнагароду Радзімы. Але не можа не радаваць ужо сама колькасць — найбольшая за апошнія гады — твораў, што ўдзельнічаюць у конкурсе — грунтоўных, яркіх твораў, кожны з якіх з'яўляецца здабыткам савецкай літаратуры, савецкага мастацтва.

Гэта быў год плённы і для нашай, беларускай культуры. Гонарам поўніцца сэрца ад таго, што ў памяняным спісе твораў, вылучаных на Ленінскія прэміі, — новыя кнігі Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Івана Шамякіна. Шчыра ўзрадавала сяброў беларускай літаратуры паведамленне аб прысуджэнні добрым, таленавітым кнігам — паэме Анатоля Вялюгіна «Вецер з Волгі», зборніку вершаў Міколы Аўрамчыка «Сустрэча былых канагонаў», раману Піліпа Пестрака «Серадзібор» — рэспубліканскіх літаратурных прэмій імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа. У нашай памяці жыве яшчэ водгулле бліскучых выступленняў Беларускага тэатра оперы і балета ў Маскве, у Крамлі. Студыя «Беларусьфільм» выпусціла на экраны краіны шэраг харошых і розных карцін... Ды хіба пералічыш усё, чым слаўны і памятны для нас год 1964-ы!

АЛЕ ЁН МІНУЎ. Ён стаў, як ужо сказана, старонкай гісторыі. І зразумела, што думкі нашы — уперадзе, у новых планах і задумах, у дарозе да новых зіхатлівых вышынь.

Было б неразумна, пагібельна для нашай літаратуры, для нашага мастацтва, для ўсяго нашага творчага, культурнага жыцця, калі б мы адно бачылі свае поспехі і не заўважалі, правільней, стараліся не заўважаць з'яў непажаданых, прыкрых, якія пакуль яшчэ ёсць і якія адчуваюць сябе не вельмі турботна ў засені вялікіх поспехаў.

Так, беларуская літаратура атрымала шырокае, небывалае прызнанне. Настолькі шырокае, што мы ўжо зусім не здзіўляемся, а, наадварот, прымаем, як належнае, як звыклае і натуральнае, і частае з'яўленне імён беларускіх аўтараў на вокладках «Раман-газеты», і паведамленні аб выхадзе ўсё новых і новых беларускіх кніжак у зарубежных выдавецтвах, і шмат якія іншыя праявы гэтай шырыні прызнання. Але хіба побач з творамі высокага натхнення, гарачага творчага дыхання, побач з глыбокім, сапраўды мастацкім адлюстраваннем сённяшняга і ўчарашняга народнага жыцця мала з'яўляецца ў нас панурай літаратурнай шэрасці, практыкаванняў, якія адно толькі па вызначэнню жанру пад назвай і імем аўтара адрозніш ад народы? Чытаеш, бывае, кнігу і дзіву даешся — няўжо яе выпусціла тое самае выдавецтва, што незадоўга перад гэтым прапанавала на кніжны рынак «Людзі на балоце» І. Мележа? Моршчышся, як ад касторкі, над аповесцю і не верыш вачам — няўжо яе друкуе той самы часопіс, са старонак якога пакрочылі па свеце гнеўныя героі «Трэцяй ракеты» В. Быкава?

У адных выпадках апраўданне такой публікацыі шукаюць у надзённасці тэмы рамана, паэмы, апавядання. Але ж даўно вядома, што самыя добрыя намеры аўтара не дасягаюць свае мэты, самая злабадзённая, важнейшая тэма «не страляе», калі твор пісаўся з халоднай крывёй, з разлікам, што «пра гэта» — не адважацца забракаваць! Больш таго — спекуляцыя на тэме шкодзіць, дыскрэдытуе важны матэрыял, выклікае недавер'е чытача і да добрых, сумленных твораў.

У другіх выпадках бласлаўляюць да друку слабую, «недацягнутую» рэч з-за маладосці яе аўтара — маўляў, педагагічныя прычыны. Але чаму ў такім разе добрыя дзядзькі шкадуюць аўтара, а не чытача? І наогул, калі гэта было, каб паблажлівасць памагала вырошчваць таленты!..

У трэціх выпадках, наадварот, друкуюць «жалезабетонны» раман ці кволенькае, хліпкае апавяданніца, шануючы паважны ўзрост, літаратурны стаж і вопыт аўтара. Але, мабыць, іменна па гэтай прычыне і не варта друкаваць няўдалую рэч — шануючы аўтарытэт і ранейшыя творы пісьменніка...

Кожны, хто сочыць за газетамі, не мог не заўважыць, якая вялікая ўвага аддаецца цяпер на прадпрыемствах і ва ўстановах барацьбе за павышэнне якасці прадукцыі. Літаратурная, мастацкая творчасць — гэта тая прадукцыя, дзе выхаваўчае, эмацыянальнае ўздзеянне на чытача магчыма толькі пры самай высокай якасці, пры самай высокай патрабавальнасці пісьменніка, мастака, артыста да сябе.

БУДЗЕМ ШЧЫРЫМІ — бадай, найменш цікавым, калі гаварыць пра беларускае мастацтва, быў мінулы год для нашых драматычных тэатраў. Вельмі мала нарадзілася спектакляў, якія б сталі падзеяй у культурным жыцці рэспублікі, выклікае трывогу доўгая адсутнасць узаемаразумення паміж тэатрамі і нацыянальнай драматургіяй, нешта не вельмі чутно і аб бліскучых рэжысёрскіх і акцёрскіх удачах.

Можа гэта гучыць занадта сурова, але тэатры нівеліруюцца, губляюць непаўторнасць аблічча, творчага почырку. Ну, скажам, чым яшчэ, апроч мовы, на якой працуюць акцёры, адрозніваецца сёння Беларускі тэатр імя Янкі Купалы ад Рускага тэатра імя Максіма Горкага? Ды ў апошнія гады яны амаль блізняты і ў падборы рэпертуару, і па скіраванасці пошукаў — калі прызнаць, што нейкія пошукі ўсё-такі ёсць.

Не ад добрага жыцця гэтая стандартнасць, гэтая адсутнасць творчай непаўторнасці. Мабыць, найпершая прычына яе — заспакоенасць, нежаданне ісці на рызыку, на патрэбную, нават неабходную для нармальнага існавання творчага арганізма смеласць. Смеласць ва ўсім — пачынаючы ад фарміравання рэпертуару, ад пошукаў і выхавання свайго драматурга, свайго рэжысёра, і заканчваючы размеркаваннем роляў у кожным спектаклі.

Праблема рэпертуару, і ў першую чаргу нацыянальнага рэпертуару, застаецца найвастрэйшай праблемай не толькі для драматычных нашых тэатраў. Беларуская музыка надзвычай рэдкая госця ў Тэатры оперы і балета. Небагаты на арыгінальныя сцэнарыі і экранізацыі лепшых твораў беларускай прозы — класічнай і сучаснай — «рэпертуар» кінастудыі «Беларусьфільм». Напярэдадні Дэкады народнай творчасці даволі часта гучаць нараканні на тое, што рэпертуар мастацкай самадзейнасці, як правіла, аблегчаны, невысокі па якасці, што ў ім вельмі мала народнага, нацыянальнага. Вядома, нараканні слушныя. Але хіба не будзе справядлівым, калі выканаўцы-аматары спытаюць беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў: а ці багаты ў нас выбар, ці многа вы ствараеце для самадзейнасці песень, аднаактовых і шматактовых п'ес і іншых твораў? Прытым твораў першакласных, якія грэх было б не ставіць, не выконваць, не паказваць.

БУЙНЫЯ, хвалюючыя падзеі чакаюць працаўнікоў беларускай культуры ўжо на самым пачатку 1965 года. Праз некалькі дзён пачнецца Дэкада рускага мастацтва ў Беларусі — урачыстае свята дружбы народаў, дружбы братніх культур. Рыхтуюцца да свайго з'езда майстры беларускага выяўленчага мастацтва. Не за гарамі трэцяя Дэкада народнай творчасці рэспублікі.

Важна, каб кожная такая падзея спрыяла далейшай актывізацыі творчага жыцця, павышэнню патрабавальнасці да сябе кожнага пісьменніка, артыста, мастака, музыканта, работніка культасветустановы.

Вядома, мы дасягнулі вялікіх поспехаў. Але з вышынь дасягнутага асабліва добра відны недахопы. А як сказана ў нядаўнім перадавым артыкуле «Праўды», «сумленне савецкага мастака, які ўсведамляе сваю асабістую адказнасць і адказнасць сваіх субрацыў па працы перад вялікім народам, вялікай эпохай, не можа абыякава глядзець на многія недахопы, прабелы ў творчасці. Сумленне пакалення нашай мастацкай інтэлігенцыі, якому гісторыяй даверана працягваць і развіваць высакароднейшыя традыцыі айчыннай і сусветнай класікі, не можа задаволіцца дасягнутым».

Прыемна ўсведамляць веліч ўскладзеных на нас задач і веру народа, што гэтыя задачы нам пад сілу.

Пачынаць з такім пачуццём новы год нашага жыцця, нашай працы, нашай творчасці — высокае шчасце.

Машыны Беларускага аўтамабільнага завода добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за рубяжом. Магутныя беларускія самазвалы працуюць у Чэхаславакіі і Індыі, Балгарыі і В'етнаме, на Кубе і ў Аб'яднанай Арабскай рэспубліцы. Зараз на заводзе выкананы канструкцыю машын, знаёмяцца з правіламі эксплуатацыі іх група кубінскіх механікаў. Вярнуўшыся на радзіму, яны будуць працаваць на нікелевым рудніку Нікара (правінцыя Арыента).

Адзнаго з кубінскіх сяброў вы бачыце на здымку. Ліноньня Рамірэс Рывэра (злева) вучыцца кіраванню аўтасамазвалам. Дапамагае яму вопытны шафёр-выпрабавальнік Іван Зіноўевіч Бабкін.

Фота Г. УСЛАМАВА. (БЕЛТА).

НОВЫЯ РАБОТЫ НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ

На Гродзеншчыне ў вёсцы Квасоўка жыве і працуе вядомы ў Беларусі народны ўмелец Станіслаў Бык. Работы яго неаднаразова экспанаваліся на рэспубліканскіх і абласных выстаўках. Над чым сёння працуе таленавіты разбяр па дрэву? Есць у самадзейнага кампазітара Аляксандра Шыдлоўскага песня «Ой, у полі дуб высокі». Гэта песня пра партызана. Стаіць у полі дуб высокі, пад ім пахаваны партызан. Над магілай сына-героя ў глыбокім засмучэнні схілілася маці... Гэты нескладаны сюжэт пакладзен у аснову новай працы Станіслава Быка.

На другой Дэкадзе самадзейнага мастацтва вялікім поспехам карысталася выступленне квінтэта з калгаса «Новае жыццё», што ў Навагрудскім раёне. Квінтэт узначальвае работнік птушкафермы стары калгаснік А. Моніч. Разбяр па дрэву С. Бык працуе цяпер над гэтай кампазіцыяй.

Самадзейны скульптар Аляксандр Ліпень — рабочы Гродзенскай электрастанцыі — зрабіў серыю партрэтаў знатных людзей Гродзеншчыны. Сярод іх — Цёткі, Кастуся Каліноўскага, генерала Парыжскай камуны Валерыя Урублеўскага. Да Дэкады народнай творчасці Аляксандр Ліпень заканчвае скульптурны партрэт Максіма Багдановіча, дзіцячыя гады якога прайшлі ў Гродна.

ВЫДАЕ «БЕЛАРУСЬ»

УЗНАГАРОДАЙ

у ў друку, актыўны
й савецкай літаратуры
дзем з дня нараджэн-
ей Моталевіч указам
-а Беларускай ССР
роджан Ганаровай
арускай ССР.

ОДНЫХ ЛЯЎ

паўнамоцт-
(гарадскіх)
Прэзідыум
пастана-
ядацеляў
на пра-

Хутка на паліцах кніжных магазінаў паявяцца першыя кнігі выдавецтва «Беларусь», датаваныя 1965 годам.

Наш карэспандэнт сустрэўся з дырэктарам выдавецтва З. Матузавым і папрасіў яго пракамянтараваць план выпуску мастацкай літаратуры на 1965 год.

— Выдавецтва аб'явіла падпіску на зборы твораў Івана Шамякіна і Петруся Броўкі. Ці закончана падрыхтоўка да выпуску гэтых выданняў?

— Так. Ужо ў другім квартале падпісчыкі атрымаюць першыя тамы зборах твораў Івана Шамякіна і Петруся Броўкі. Абодва выданні меркавалася зрабіць чатырохтомнымі, але па просьбе падпісчыкаў збор твораў Івана Шамякіна павялічан на адзін том — сюды ўключаны раман «Сэрца на далоні».

У двух тамах мы выдаём выбраныя творы Уладзіміра Дубоўкі. У двухтомнік уключаны лепшыя вершы са зборнікаў «Там, дзе кіпарысы», «Крэда», «Кругі», «Палеская рапсодыя», а таксама паэмы, балады і казкі, напісаныя паэтам у апошнія гады.

У 1964 годзе Адам Русак адзначыў сваё шасцідзесяцігоддзе. Мы выдаём зборнік паэта «Песні роднага краю». Разам з вядомымі вершамі ў кнігу ўключаны і новыя творы.

У 1965 годзе выйдуць таксама зборнік выбраных твораў Міколы Хведаровіча і зборнік выбраных казак вядомага збіральніка беларускага фальклору А. Сержпутоўскага.

— А якія новыя творы беларускіх празаікаў выйдуць у 1965 годзе?

— Мы выпусцім у свет раманы, аповесці, апавяданні, запіскі А. Алешкі, Я. Брыля, А. Зарыцкага, А. Кулакоўскага, М. Лобана, І. Мележа, Р. Няхая, Р. Сабаленкі, А. Чарнышэвіча. З буйных празаічных твораў хочацца перш за ўсё назваць раман М. Лобана «І душою і сэрцам», які з'яўляецца працягам яго папярэдняй кнігі «На парозе будучыні», другую частку палескай дылогіі І. Мележа — «Навальніца над полем», другую кнігу рамана «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча. Выдадзім мы таксама раман В. Федасеенкі «Дубовая града».

Цікавымі абяцаюць быць творы маладых празаікаў. У наступным годзе ў нас выходзяць зборнікі В. Адамчыка, Л. Гаўрылкіна, І. Чыгрынава.

Упершыню выдаецца раман-хроніка М. Гарэцкага «Віленскія камунары». Выйдзе таксама дзённік студэнта М. Малочкі, які загінуў на Фінскім фронце ў 1940 годзе.

Мемуарная літаратура будзе прадстаўлена ўспамінамі Паўліны Мядзёлкі «Сцежкамі жыцця». Першая выканаўца галоўнай ролі ў бессмяротнай камедыі «Паўлінка» была добра знаёма з народным песняром Янкам Купалам, са Змітраком Бядулем, Цішкам Гартным.

— Якія новыя ... паэзіі рыхтуюцца ... друку?

— Аматарам паэзіі мы прапануем каля дваццаці дзесяткаў паэтычных зборнікаў.

Партызанскія сябры Анатоля Астрэйкі... шлі нядаўна ... вершаў, які бы... ны ў час вайны ... вершы гэтага ... таксама творы... ныя ў апошні... ўвойдуць у н... нік паэта «С... сцеж».

«З глыбокіх ...» — так назваў с...

Мы выпускаем перш... свой зборнік «Дзен... ларускай паэзіі».

— А якія тво... пусціць выдав... праблемат... зн...

У ГЭТЫЯ НУМАРЫ

У НОВЫМ ГОДЗЕ — ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ

ЧАКАЕМ ВАС, ДАРАГІЯ ГОСЦІ

ШКОЛА І ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

НОВЫЯ СПЕКТАКЛІ ГРОДЗЕНЦАЎ

СЯРОД КНІГ

РЫХТУЮЦЦА ДА ВЫДАННЯ



НАВАГОДНІ МІНСК. (Ленінскі праспект у раёне Валгаградскай).

У года... Савета... па друк... конкурс... шых пра... гі.

Ганаровы... і каштоўны... мі ўзнагарода... сы «Беларусь»... ка», газеты «Чырво... змена» і «Настаўніцкая газета», Дзяржаўны камітэт па радыёвяшчанню і тэлебачанню Савета Міністраў БССР і абласныя газеты «Гомельская праўда», «Гродненская праўда», раённыя газеты «Ленінскі шлях» (Орша) і «Камуніст» (Бабруйск).

Адзначаны ўзнагарадамі і самыя актыўныя грамадскія распаўсюджвальнікі кнігі. У іх ліку — старшыня савета садзейнічання магазіна навукова-тэхнічнай кнігі горада Мінска доктар біялагічных навук прафесар М. Меражынскі, кандыдат біялагічных навук Д. Шапіра, кандыдат гістарычных навук дацэнт Гродзенскага педагагічнага інстытута В. Ваяхін і іншыя.

БЕЛТА.

БРАТЭРСТВА НАРОДАЎ — БРАТЭРСТВА КУЛЬТУР

Беларускі і рускі народы звязаны між сабой шматгадовай дружбай, якая асабліва ўзмацнілася і расшырылася пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Іх духоўная блізкасць і цесныя ўзаемасувязі ярка праявіліся ў будаўніцтве новай, сацыялістычнай культуры. За гады Савецкай улады непазнавальна вырасла беларускае мастацтва.

Беларусь можа па праву ганарыцца сваім Акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета, на сцэне якога ставяцца буйныя музычныя палотны класічнага рэпертуару і творы савецкіх, у тым ліку беларускіх, кампазітараў. Цікавымі творчымі калектывамі, якія заўсёды з'яўляюцца жаданымі гасцямі ў любым горадзе Расійскай Фэдэрацыі, зарэкамендавалі сябе Акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Беларускі тэатр імя Я. Коласа, Рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага.

Добра ведаюць у розных кутках нашай Радзімы па шматлікіх гастролях Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу БССР, Дзяржаўны народны аркестэ БССР, Дзяржаўны народны хор БССР, Ансамбль танца Беларускай ССР,

У нашай краіне шырока практыкуецца артыстычны абмен канцэртнымі праграмамі паміж рознымі творчымі арганізацыямі, які ўзаемна ўзбагачае мастацтва братніх рэспублік. Гэта стала добрай традыцыяй і трывала ўвайшло ў наша культурнае жыццё. У дні святкавання 20-годдзя вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў работнікі беларускага мастацтва выступалі з творчай справаздачай на сцэнах Масквы і атрымалі высокую ацэнку сталічных гледачоў.

З 9 па 18 студзеня г.г. дзеячы музыкі, тэатра, выяўленчага мастацтва і кіно Расійскай Федэрацыі будуць дэманстраваць перад працоўнымі Беларусі свае творчыя поспехі. У госці да беларускага народа прыедуць праслаўленыя калектывы — сімфанічны аркестр Маскоўскай дзяржаўнай філармоніі, Рэспубліканская руская харавая капэла, Дзяржаўны рускі народны хор імя М. Пятніцкага, ансамбль скрыпачоў Вялікага тэатра СССР, квартэт імя Бетховена.

Сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі — адзін з шырокавядомых аркестравых калектываў Савецкага Саюза, які атрымаў прызнанне ў сябе на радзіме і за мяжой. Мастацкім кіраўніком аркестра зараз з'яўляецца таленавіты дырыжор, заслужаны артыст РСФСР К. Кандрашын. Асноўнае месца ў абшырным рэпертуары аркестра займае музыка XX стагоддзя, савецкая і замежная.

Рэспубліканская руская харавая капэла пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР А. Юрлава заваявала вялікую папулярнасць сярод слухачоў братніх рэспублік. Асваенне лепшых узораў харавой класікі, работа над навінкамі савецкіх кампазітараў вылучаюць гэты калектыў у лік лепшых акадэмічных хораў краіны.

А хто не ведае ў нас Народнага хору імя М. Пятніцкага (мастацкі кіраўнік — заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР В. Левашоў), які з'яўляецца страсным прапагандыстам рускай народнай творчасці? У рэпертуары хору — народныя песні і творы савецкіх кампазітараў.

Вялікай падзеяй Дэкады рускага мастацтва ў Беларусі з'явіцца ўдзел у аўтарскіх канцэртах выдатных савецкіх кампазітараў — лаўрэатаў Ленінскай прэміі, народных артыстаў СССР Д. Шастаковіча і А. Хачатурана, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, народнага артыста СССР Ц. Хрэннікава, лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага артыста РСФСР Г. Свірыдава, лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага артыста РСФСР В. Салаўёва-Сядога, кампазітараў А. Эшпая, Р. Шчадрына, Г. Носава, Ул. Сарокіна, Я. Радыгіна, Э. Калманоўскага, А. Астроўскага, М. Каваля, А. Фляркоўскага.

Шырока будзе прадстаўлены ў дні Дэкады вакальны жанр. Беларускія слухачы пазнаёмяцца з творчасцю аднаго з найбольш таленавітых спевакоў Вялікага тэатра, народнага артыста СССР І. Пятрова; пабываюць на сольных канцэртах выдатнай савецкай спявачкі, народнай артысткі РСФСР З. Далуханавай, якая валодае самабытнай творчай індывідуальнасцю; пачуюць у спектаклях і на канцэртах яркія, прыгожыя галасы народных артыстаў РСФСР Я. Алтуховай і З. Анджапарыдзе, заслужаных артыстаў РСФСР Я. Кібкала, Г. Дударава, Н. Ісакавай, артыстаў Л. Баб-рынёвай, Э. Андрэева і іншых.

Парадуюць сваёй разнастайнай таленавітасцю, незвычайным артыстызмам салісты балета Вялікага тэатра, народная артыстка СССР М. Плісецкая, народны артыст РСФСР Н. Фадзеечаў, а таксама маладыя танцоўшчыкі трупы Вялікага тэатра А. Рабінкіна і М. Ліепа.

А колькі цікавага і новага пачуюць аматары мастацтва на вечарах камерна-інструментальнай музыкі! Тут выступяць ужо вядомыя майстры-выканаўцы С. Рыхтар, І. Ойстрах, В. Фейгін, Е. Альтман і група таленавітай моладзі — пераможцы на розных міжнародных конкурсах Н. Шахаўская, А. Міхлін, Я. Малінін, Д. Башкіраў, І. Жукаў, В. Пікайзен, Я. Магілеўскі.

Мінчане і жыхары многіх іншых гарадоў пабываюць на творчых вечарах народнага артыста СССР С. Абразцова і народнага артыста РСФСР А. Райкіна, пазнаёмяцца з разнастайным эстрадным мастацтвам, якое будуць прадстаўляць М. Крысталінская і Т. Міянсарава, Н. Дорда і Б. Бруноў, В. Варанец і Г. Дуднік.

У перыяд Дэкады будзе экспанавацца дзесяць мастацкіх выставак. Сярод іх — экспазіцыі з твораў Дзяржаўнай Траццяковскай галерэі і «Мастакі Расійскай Федэрацыі». У Мінску і абласных цэнтрах рэспублікі адкрыюцца персанальныя выстаўкі народнага мастака СССР лаўрэата Ленінскай прэміі Ул. ... ворскага, народнага мастака СССР лаўрэата ... жаўнай прэміі М. Жукава, мастакоў Н. Ка... В. Багаткіна. Выстаўка сатырычнага плаката «... аловак» будзе наладжана ў Магілёве.

Ні адна з ранейшых нашых творчых Дэкад ... такой вялізарнай і разнастайнай па праграме ... касці ўдзельнікаў і ахопу гарадоў.

Дэкада рускага мастацтва ў Беларусі будзе ... часова праходзіць у пяцідзесяці гарадах ... пунктах. Урачыстае адкрыццё Дэкады ... Мінску, Брэсце, Гомелі, Віцебску, Гр... Адбудзецца мноства творчых сустрэ... Беларусі.

У канцэртныя праграмы мастацкіх ... лістаў-выканаўцаў уключаны творы ... музыкі і найбольш значныя творы ... тараў. Аматары музыкі несумненн... май «Пакаранне смерцю Сяр... коўча, Першай сімфоніяй і ... на з аркестрам Ц... ...эннік... сам аўтар), «Патэт... ці Сяргея Ясеніна ... Канцэртам-рапсод... Сімфоніяй-паэмай ... «Гарэзлівымі ча... для фартэпіяні... Многія з гэтых ... русі, тут адб...

У Белару... спектаклях ... у «Лебядз... рыдзе — ... дама», Я. ... кіна і М. ... «Спартак ... А. Хачат...

Усе ... чаць с... працоў... нікі Д... эстэт... крыю... шым... бр... м...

...АНОМІМ:

...нікаў, якія выкладаюць лі-
...асе, быў арганізаваны семі-
...прагрэсіўнай зарубежнай лі-
...а гадзіну лектар «прайшоўся» па
...нцузскай і амерыканскай літаратуры. Выкладчыца, што сядзела побач са мной, — яе лічыць добрым педагогам (умее «прымусіць вучыць» літаратуру) — увесь час перапытвала лектара, патрабуючы, каб ён запісаў на дошцы імя пісьменніка. І ён пісаў: «Эльза Трыале, Луі Арагон...»

Не паспяваючы пра ўсё запытацца, яна запісвала сама: «Хемін Гуэй — прагрэсіўны амерыканскі пісьменнік». Выпадкова заглянуўшы ў запісы суседкі, я спалохалася: я не хацела б яе, «добрага педагога», бачыць настаўніцай свайго сына.

Вядома, ёсць сярод нас, настаўнікаў, людзі, якія застылі на ўзроўні ведаў, уяўленняў і меркаванняў, атрыманых калісьці даўнымдаўно ў інстытуце. І ўсё ж хочацца верыць, што такіх сярод нас нямнога, не яны вызначаюць аблічча нашай школы. Чаму ж кожнага з нас ахоплівае пакутлівы роздум, які не пакідае ні ўдзень, ні ўночы, чаму мы вядзём бясконцыя дэбаты ў настаўніцкай і ўжо колькі гаварылі пра вялікіх кампазітараў і мастакоў, колькі слоў сказана пра неабходнасць умець знаходзіць і адчуваць прыгожае вакол сябе, а ў дзяцей нашых самы папулярны сёння музычны твор — песня пра чорнага ката?!

Не ведаю, як хто, а я адразу пагадзілася са сцвярджэннем аўтараў артыкула «Дарогі ў свет прыгожага», што «агульны стан эстэтычнага выхавання школьнікаў задаволіць нікога не можа». І не толькі пагадзілася. Хочацца дадаць, што ў нашай школе зусім адсутнічае сістэма эстэтычнага выхавання.

Каб сур'ёзна гаварыць пра такое выхаванне, трэба, відаць, гаварыць пра тое, як і якімі шляхамі «надзяліць» нашых дзяцей добрым эстэтычным густам, як і што робіць, каб кожны Пеця або Сярожа не толькі ўмеў разважаць пра заданне настаўніка аб прыгожым, але адчуваў унутраную неабходнасць цягнуцца да прыгожага ва ўсіх праявах жыцця, умеў бачыць і знаходзіць яго, умеў змагацца за яго.

Ці маем мы, настаўнікі, умовы, каб робіць гэта? Не! Хоць кожны з нас многае можа расказаць аб тым, якія гутаркі ён праводзіў, якія работы пісалі яго вучні, якія экскурсіі ён арганізаваў.

Звернемся да праграм. На першы погляд здаецца, што ў іх ўсё прадугледжана: ёсць урокі спеваў, дзе, паводле прэамбулы, вучань павінен і асновы музычнай граматы вывучаць, і гутаркі пра кампазітараў выслухаць, і пазнаёміцца з лепшымі творамі савецкай і зарубежнай класічнай і сучаснай музыкі; ёсць урокі ...ання, ёсць, нарэшце, і ...атуры, ...рэкамендуецца выхоўваць у вучняў разум... прыгожага.

Заглянем у план выхаваўчай работы: там ёсць асобны раздзел — «Эстэтычнае выхаванне вучняў», у якім запланаваны гутаркі, гутаркі і зноў гутаркі.

Як жа ўсё гэта выглядае на справе? Адзін і той жа педагог першыя чатыры гады вучыць школьнікаў усім прадметам, у тым ліку спевам і маляванню. Аднак вядома, што не кожны настаўнік (і гэта бывае вельмі часта) валодае схільнасцямі і цікавасцю да гэтых дысцыплін. Лёгка сабе ўявіць, што даюць дзецям такія ўрокі!

Пра якое выхаванне эстэтычнага густу, пра якое разуменне і любоў да класічнай музыкі можна гаварыць, калі ва ўсе наступныя гады знаходжання вучня ў школе ўрокі спеваў суправаджаюцца сумным, не заўсёды кваліфікаваным брынканнем домры або, у лепшым выпадку, баяна. А ў большасці сельскіх школ нават гэтае «брынканне» — раскоша. «Гадзінамі» спеваў «дагружаюць» географаў, хімікаў. У школах няма фанатэк, няма звычайных прайгравальнікаў, няма сродкаў, каб плаціць выкладчыкам-музыкантам і харэографам. Вось таму «пад язык» і рыхтуецца самадзейнасць да свята.

Вядома ж, голас настаўніка непазбежна патоне ў патоках джазавай музыкі, па-майстэрску выкананай, бо да яе паслуг і радыёперадачы, і тэлевізар, і іншыя сучасныя і магутныя віды прапаганды.

«Любіце музыку Бетховена!» — гаворым мы вучням. І не толькі гаворым. На ўроку літаратуры ў 10 класе гутарка ідзе пра нарыс Горкага «Ленін». Колькі сказана тут аб духоўным багацці, аб рознабаковасці інтарэсаў Уладзіміра Ільіча. Прыносіш на ўрок грамзапіс санаты «Апасіяната» (умудраешся выкраіць час, а гэта ж нялёгка!). І ўсё ж, улавіўшы твой запытальны погляд: «Падабаецца?» — дзеці вінавата адводзяць вочы. Ім хацелася б падзяліць тае пачуцці, яны добрасумленна стараюцца гэта зрабіць, але аднаго жадання мала: не можа кожны вучань без адпаведнай падрыхтоўкі адчуць, у дадзеным выпадку, «Апасіянату» Бетховена.

Нам здаўся б па меншай меры дзіўным чалавек, які б узяўся вучыць дзяцей прамудрасцям вышэйшай матэматыкі, калі яны не засвоілі табліцу множання. А ў пытаннях эстэтычнага выхавання атрымліваецца так: у розных элементах эстэтычнага ўздзеяння няма заканамернасці. Тое, што робіцца, — робіцца ад мерапрыемства да мерапрыемства.

Некалькі слоў аб праграмах па літаратуры. Кожнага настаўніка, які працуе па існуючай праграме, не можа пакінуць пачуццё віны перад вучнямі. Здзеклива гучаць размовы аб неабходнасці навучыць дзяцей адчуваць літаратуру, калі за год вучобы ў 9 класе трэба «прайсці» ўсё, пачынаючы са «Слова аб палку Ігаравым» і канчаючы Чэхавым. «Паспець! Укласціся! Прайсці!» — вось што, як дамоклаў меч, вісіць над галавой настаўніка і, зразумела, вучня.

Ці можна пазбаўляць вучня ведання літаратуры і мовы (у старшых класах адсутнічаюць гадзіны мовы) толькі таму, што больш модным прадметам цяпер з яўляюцца прадметы вытворчага цыкла, хімія?!

Не патрабуе доказаў думка, што ніякая разумная машына не заменіць Разумнага Настаўніка. Ведаючы наша настаўніцтва, я маю права сказаць, што часам мы «не гарым» не таму, што не хочам, а таму, што не можам: мала ведаем.

Пасля інстытутаў (а ў іх жа мы прыйшлі з нашых школ) большасць з нас працуе ў такіх месцах, дзе няма ні філармоніі, ні карцінных галерэй. А тое, што атрымана ў інстытутах па пытаннях разумення мастацтва, не можа ні ў якой меры задаволіць нас, гэта адчуваеш у першы ж месяц работы ў школе. Але можна папрацаваць 10—15 гадоў і ніхто ніколі не прапануе табе ніякіх курсаў, як гэта, скажам, арганізавана ў медработнікаў. Бываюць, вядома, семінары, такія, аб якіх я гаварыла вышэй: агляд французскай і амерыканскай літаратуры за гадзіну. І тут, як і ў выпадку з домрай, грамзапісамі і інш., — эканомія сродкаў.

Ці можна апраўдаць такую эканомію? На кім мы эканомім? На нашым будучым, на нашых дзецях! Ці не вельмі дарагой цаной ажыццяўляецца гэта эканомія?

Нарэшце, ці не час перайсці ад слоў да справы: вырашыць гэтыя пытанні ў агульнадзяржаўным маштабе, а не пакідаць іх вырашэнне на асабістую кемлівасць і разворатлівасць кожнага дырэктара школы, кожнага педагога па прынцыпу: хто як можа.

Мы адчуваем патрэбу ў дакладнай, выразнай сістэме эстэтычнага выхавання, выказанай у прадуманых праграмах. Мы маем патрэбу ў кваліфікаваных выкладчыках музыкі, малявання, кіраўніках самадзейнасці, і мы маем патрэбу ва ўмовах. Праблема эстэтычнага выхавання нашых дзяцей павінна стаць праблемай нумар 1.

І. КАРПЮК,
настаўніца 12 сярэдняй школы г. Гродна.

НЕКАЛЬКІ ДУМАК

Памыляецца той, хто лічыць, што эстэтычнае выхаванне можна добра паставіць толькі ў школах вялікіх гарадоў, дзе ёсць музеі, карцінныя галерэі, тэатры, канцэртныя залы. Магчымасць выхоўваць у дзяцей пачуццё прыгожага ёсць у кожнай школе, сям'і, у любым горадзе або вёсцы.

...аста бываю ў школах. Шмат дзе ба-
...правільна і разумна, рознымі мета-
...камі выхоўваюць педагогі ў вучняў
...густ. Аднак сустракаецца і такое,
...біста лічу няправільным.
...ж пераважае «гурткоўая» сістэма
...а выхавання. На маю думку, яна мае
...кладны кірунак. Школа, настаўнікі,
...несвядома, арыентуюцца на раз-
...цей адзіночак, якія ў некато-
...ўмеюць спяваць, маляваць,
...ых інструментах і г. д. А мне
...важней даць хаця б самыя
...ства ўсім школьнікам, на-
...разумець хаця б самыя
...а — цяжэй, але гэта —

...мыць знаёмства з выяў-
...т паказвае, што шко-
...ўкнымі назвамі, а
...ныя т...аўкі або
...і ў пер-
...творча-

...сці і рэпрадукцый вядомых карцін. Пры гэтым трэба аддаць вялікую ўвагу азнаямленню вучняў з моваю, з жанрамі выяўленчага мастацтва. Многія вучні (ды і настаўнікі) не ведаюць, напрыклад, чым афорт адрозніваецца ад літаграфіі, а станковы жывапіс ад дэкаратыўнага і г. д.

Далей. Я не ўяўляю сабе, каб школьнік заявіў, што ён не збіраецца быць ні пісьменнікам, ні паэтам і таму не будзе чытаць кнігі і хадзіць на ўрокі літаратуры. А вось выпадкі, калі дзеці прыкладна ў такім духу вызначаюць свае адносіны да музыкі, нярэдкія. І гэта не дзіва. Бо, скажам, урокі спеваў у школах Мазыра і раёна, як правіла, праводзяцца без музычных інструментаў. Музычныя вечары рэдкая і выпадковая з'ява як у школах, так і ў гарадскім Доме піянераў. Няма ў школах магнітафонаў, рэдка адбываецца праслухоўванне музычных твораў у грамзапісе.

Узровень эстэтычнай культуры многіх настаўнікаў вельмі нізкі. Гэта часткова тлумачыцца тым, што нашы педагагічныя вышэйшыя навучальныя ўстановы не даюць сваім выхаванцам шырокага кругагляду, не выхоўваюць студэнтаў эстэтычна. Потым, калі ўжо студэнт стане настаўнікам, яму нялёгка выправіць гэты недахоп. Перагружаны работай у школе, ён не мае магчымасці рэгулярна наведваць тэатры, філармоніі, мастацкія музеі, асабліва калі жыве ў сельскай мясцовасці.

Значныя недахопы ў эстэтычным выхаванні студэнтаў ёсць і ў нашым інстытуце. У Мазыры, як вядома, няма мастацкіх музеяў, тэатра. Праўда, ёсць музычная школа, але яе выкладчыкі асаблівай дапамогі нам не аказваюць. Спадзявацца можна, галоўным чынам, на свае сілы.

Час адкрыць у інстытуце, хоць на грамадскіх асновах, факультэт мастацкіх прафесій, дэвізам якога можа быць: вучыся, каб вучыць іншых.

Нельга не адзначыць, што пытанні эстэтычнага выхавання рэдка абмяркоўваюцца на сходах бацькоў, амаль не чытаюцца лекцыі на гэтую тэму ў лекторыях гарадскога парку, Дома культуры, у клубах.

«Дзяцей выхоўвае ўсё: людзі, прадметы, з'явы. Але больш за ўсё — людзі». Гэтая глыбока правільная думка А. С. Макаранкі адносіцца і да арганізацыі эстэтычнага выхавання.

М. ГЕТМАНСКІ,
загадчык кафедры методыкі Мазырскага педагагічнага інстытута.

ТРЭБА ПАВЯЛІЧВАЦЬ, А НЕ СКАРАЧАЦЬ

Я ў асноўным згодзен з аўтарамі праблемнага артыкула «Дарогі ў свет прыгожага». Аднак, на маю думку, у ім ёсць адзін істотны недахоп: віну за прабелы ў эстэтычным выхаванні школьнікаў пісьменнікі і дзеячы мастацтва амаль цалкам усхладаюць на настаўніка. Згодзен, што перш за ўсё ад школы, ад таго, які кірунак яна дасць дзіцячай дапытлівасці, як адкажа на дзіцячае імкненне ведаць, што такое добра, што такое кепска, што прыгожа, а што не, залежаць эстэтычныя густы людзей. Аднак нярэдка школа не можа даць такога выхавання па чыста аб'ектыўных прычынах. Я маю на ўвазе выкладанне маляванння. Настаўнікаў-спецыялістаў не хапае, і як бы ні жадаў дырэктар найлепш наладзіць выкладанне гэтага прадмета, ён вымушан даручаць яго ў якасці «дагрузкі» выкладчыку без належнай падрыхтоўкі.

Тут варта сказаць пра іншае. Цяпер маляванне як прадмет вывучаецца толькі на факультэтах методыкі пачатковага навучання ў педагагічных інстытутах. Але, па-першае, такія факультэты ёсць не ў кожным інстытуце, па-другое, у апошні час намецілася яўная тэндэнцыя да іх скарачэння. Так, у Гродзенскім педінстытуце некалькі гадоў назад на першы курс прымалі 100 чалавек, цяпер жа толькі 50. Зразумела, што такой колькасці выпускнікоў зусім недастаткова. Калі да таго ж улічыць, што яны будуць працаваць у пачатковых класах, то лёгка зрабіць вывад: у 5—7 класах, г. зн. у тым узросце, калі дзеці найбольш успрымальныя і здольныя лягчэй за ўсё авалодваць навыкамі ў маляванні, яны аказваюцца без кіраўніцтва спецыялістаў.

Мастацка-графічны факультэт ёсць толькі ў адной педагагічнай вышэйшай навучальнай установе рэспублікі — у Віцебскім педінстытуце. Але тут рыхтуюць спецыялістаў, на маю думку, занадта шырокага профілю. Яны, паводле дыплома, павінны весці ў школе чарчэнне, маляванне і вытворчае навучанне. Можа я памыляюся, але такое спалучэнне лічу надзвычай дзіўным. Маляванне бліжэй да гуманітарных дысцыплін, чым да чарчэння і, тым больш, урокаў працы.

І яшчэ адна думка. На мой погляд, Міністэрству асветы варта падумаць аб тым, як спалучыць, зблізіць літаратуру і маляванне. Настаўнікам літаратуры трэба часцей, пры кожным зручным выпадку, выкарыстоўваць на ўроках рэпрадукцыі са здабыткаў выяўленчага мастацтва. Гэта паможа вучням і ва ўспрыняцці мастацкага слова, і ў разуменні мастацтва фербаў.

І. ШЫШКО,
выкладчык малявання Гродзенскага педагагічнага інстытута.

...ЗАПРАШЭННЕ Ў ДОМ ...СТАЎНІКА

...ны аднапавярховы дом шмат
...бруйску. Тут заўсёды поўна
...хатняму ўтульна. Вечарамі
...чыць музыка, чуваць ба-
...на паслухаць цікаў-
...дзельнічаць у

...ожа
...ж

Шмат павучальнага, цікавага можна пачуць і ў выпусках вусных часопісаў «Юнацтва», «Хачу ўсё ведаць», якія рэгулярна выпускае клуб старшакласнікаў. Вучні знаёмяцца з карцінамі славутых мастакоў, вучацца разумець, аналізаваць мастацкія творы.

Як прыгожа апранацца, якую прычоску насіць? Гэта таксама не дробязі ў эстэтычным выхаванні школьнікаў. Дзеля гэтага на «Агеньчыку» старшакласнікі запрашаюць мадэльераў, цырульнікаў.

І яшчэ адзін клуб створан пры Доме настаўніка—«Турыст». Узначальвае яго настаўнік геаграфіі В. Жыдц. Вогнішчы турыстаў гарэлі не толькі ў ваколіцах Бабруйска, а і ў ...алескіх пушчах, на берагах Нёмана і Нара-
...Настаўнікі і юныя турысты робяць краяў-
...чыя запісы, фотаздымкі, збіраюць цікаў-
...ыкапні, рэдкія расліны. Прырода ж не-
...ая крыніца мастацтва, лірыкі! Пазна-
...ніцы прыроды, навучыцца любіць і
...гэта значыць глыбей разу-
...гожага.

...у Доме настаўніка і вусны
...а і жыццё», які рэдагуе на-
...знікава. Ён стаў прапагандыстам
...вопыту, цікавых навін. У адным
...часопіса настаўніца В. Захарава
...эстэтычным выхаванні вучняў у
...коле № 23. Тут створаны школь-
...я студыя, хор хлопчыкаў, драма-
... Ёсць у школе і свая «Малая
...у якой сабраны рэпрадукцыі
...іх і савецкіх мастакоў.
...«Клуба вясёлых і зна-

...двухгадовым перспек-
...Дома настаўніка, зной-
...ых мерапрыемстваў на
...е выхаванне школьнікаў
...звяртаюць асаблівую
...мнявацца, што яны зро-
...кірунку.

Я. РЭЗНІКАЎ,
журналіст.

Е ЗАБЫВАЦЬ МОРА!..

...ных, а хто і
...правах у горад.

У акружэнні сяброў спускаўся па трапу матрос Віктар Шрамякоў. Служба скончылася—развітваўся з пабрацімамі.

— Браточкі, — усклікнуў нехта з матросаў,—а ці не забыліся Віктару ў чамадан малаток або ключ манціровачны пакласці?.. На працоўнае шчасце!..

— Яму б лепей пэндзаль пакласці, — адказаў другі матрос.— Можа калі і нас намалюе, не забудзецца на марское жыццё.

Сябры ведалі—пра што гаварылі. Не сумняваліся — стане іх пабрацім Віктар мастаком.

— Не забывай мора, — казалі наперабой.

Віктар апусціў рукі па швах, шчоўкнуў абцасамі:

— Ёсць, не забываць мора!..

...Паспяхова вытрымаў Віктар экзамены ў Віцебскае мастацкае вучылішча. І пабеглі дзень за днём у напружанай вучобе, у працы, у авалоданні сакрэтамі творчасці. Ён вырашыў пісаць дыпломную работу на марскую тэму. Гэта была карціна «Ля студні». Яна атрымала станоўчую ацэнку экзаменацыйнай камісіі. Карціна расказвала пра павагу савецкіх людзей да маракоў. Просты яе сюжэт—дзяўчына падае кубак халоднай вады матросу—быў вырашаны хвалююча.

Знешне можа здацца, што ўсё ў Віктара атрымлівалася лёгка, проста: адслужыў на флоце, скончыў паспяхова вучылішча, паспяхова здаў экзамены ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. На справе ж не ўсё ішло так лёгка. Галоўныя цяжкасці былі «ўнутранага парадку». Дыпломная работа ў тэхнікуме была вельмі далёкая па сваіх вартасцях ад тых «сапраўдных» твораў пра мора, аб якіх марыў Віктар.

Каб ствараць творы, пра якія марыў, многае трэба было пераадолець: і дасканала вывучаць тэо-
...ы выканаўсу. І зразумець сакрэты творчасці любімых мастакоў—Макоўскага, Левітана, Рэпіна, майстроў Адраджэння. І яшчэ трэба было самому працаваць нястомна і паўсядзённа і над малюнкамі, і над эцюдамі, і над эскізамі.

Шукаючы кампазіцыйнае выяўленне творчых задум, нярэдка Віктар разгортваў свае дзённікі, праглядаў накіды, зробленыя ў час марскіх паходаў, у даўнія ўжо гады службы на флоце. Прыгадваліся суровыя, маўклівыя нарвежскія берагі, маўклівая Новая Зямля, штармавое Баранцава мора. А часцей за ўсё ўспамінаў сяброў—матросаў, боцманаў, камандзіра карабля і яго намесніка. Гэта яны выхавалі ў ім веру ў сябе, у свае сілы, веру ў дружбу, веру ў сваю здольнасць пераадолець любыя цяжкасці на шляху да пастаўленай мэты.

Каб асвяжыць ўражанні ад службы на флоце, каб сваімі вачыма пабачыць тое новае, што прыйшло на флот за гады, пакуль Віктар вучыўся мастацтву, трэба было яшчэ раз пабываць на баявых караблях. Міністэрства абароны дазволіла Віктару Шрамякову творчую камандзіроўку на Балтыйскі і Чарнаморскі флоты.

Ізноў паходы. Ізноў шумны флоцкі кубрык. І, вядома, любімае «Яблучка», і вясёлая песня. І штормы, і барацьба са стыхіяй. Віктар назіраў жыццё карабля вачыма мастака, рабіў мноства накідаў і замалёвак. Вярнуўшыся з камандзіроўкі, прадставіў на творчай кафедры ў інстытуце справаздачу—шэраг кампазіцый на марскую тэму.

Кампазіцыі «У часе шторму», «Будні на караблі», «Вахценныя» былі досыць спелымі па змесце і па кампазіцыйнаму вырашэнню, сведчылі аб цікавым пошуку маладога мастака.

Цяпер Віктар працуе над дыпломам. Гэта будзе пяць кампазіцый на тэму «На абароне марскіх рубяжоў».

Вось адна з кампазіцый —«Баявая трывога»: матросы выскокваюць праз люк на верхнюю палубу і разбягаюцца па месцах. Моцны вецер рве гюйсы, лентачкі на бесказырках. Шэрае неба праразаюць рэактыўныя самалёты.

Кампазіцыі «Пад'ём сцяга», «Рапарт», «Пільнасць», «Карабельныя будні» расказваюць пра паўсядзённае флоцкае жыццё.

— Мне хочацца стварыць вобраз савецкага ваеннага марака, суровага і ўмелага, чалавечнага і складанага, — гаворыць Віктар пра сваю работу.

Мара былога матроса Віктара Шрамякова ажыццяўляецца.

А. ГАРБУЗАЎ,
слухач Мінскай ВПШ.

ЧАСОПІСЫ Ў 1965-м

ТЕАТР

Наш карэспандэнт звярнуўся да галоўнага рэдактара штомесячнага часопіса драматургіі і тэатра, органа Саюза пісьменнікаў СССР і Міністэрства культуры СССР «Театр» Ул. Піменава з просьбай расказаць аб планах часопіса на 1965 год. Вось што паведаміў галоўны рэдактар часопіса:

— Мы публікуем разнастайныя матэрыялы пра савецкі і замежны тэатр, тэарэтычныя работы па эстэтыцы і праблемах майстэрства, творчыя партраты артыстаў і рэжысёраў, успаміны вядомых дзеячоў сцэны. У ножным нумары друкуецца новая п'еса.

У 1965 годзе часопіс правядзе творчую дыскусію «Драматург і рэжысёр».

Часопісу перадаюць свае новыя п'есы Васіль Аксёнаў, Аляксей Арбузаў, Андрэй Вазнясенскі, Аляксандр Карняйчук, Андрэй Макаёнак, Георгій Мдзівані, Віктар Розаў, Афанасій Салынскі, Канстанцін Сіманаў, Юхан Смуул, Анатоль Сафронаў, Аляксандр Штэйн.

Мемуары піша для часопіса Аліса Каонен.

Пра сваю творчую праграму расказваюць на старонках часопіса галоўныя рэжысёры тэатраў Масквы.

З роздумам аб праблемах мастацкага майстэрства выступяць М. Акімаў, Ю. Завадскі, М. Кнебель, В. Аглоблін, М. Ахлопкаў, В. Пансо, Р. Плят, Я. Сіманаў, Р. Сіманаў, Г. Таўстаногаў, Ф. Шышыгін.

Будуць апублікаваны ўрыўкі з запісных кніжак В. Лужскага, К. Марджанава, Ус. Меерхольда, А. Д. Папова, Л. Суляржыцкага.

Майстрам тэатра Б. Бабачкіну, А. Васадзе, А. Грыбаву, А. Клімавай, В. Кусенка, В. Ляпко, П. Луспякаеву, Г. Нерсясяну, Б. Платонаву часопіс прысвячае спецыяльныя ілюстраваныя нарысы.

З першага нумара 1965 года будуць друкавацца ўспаміны адной з папулярнейшых французскіх спявачак Эдзіт Піаф. Гэта — расказ пра сябе, пра Парыж, пра славутых шансанье Францыі.

Што яшчэ можна сказаць пра наш часопіс спецыяльна для беларускіх чытачоў?

Сетка карэспандэнтаў часопіса «Театр» у Беларусі пашыраецца. Мы ставім сваёй задачай больш глыбока асвятляць жыццё прафесіянальных і народных тэатраў рэспублікі, публікаваць п'есы беларускіх драматургаў, сачыць за іх творчасцю.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

«Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы — гэтая сатырычная камедыя адноўлена на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. З студзеня адбылася прэм'ера. У спектаклі былі заняты артысты Л. Рахленка, В. Попа, С. Бірыла, З. Стома, Р. Філіпаў, М. Захарэвіч, Б. Платонаў, Л. Федароўская, Л. Рэйцкая, А. Бараноўскі, Б. Дакальская, А. Луцэвіч, М. Струсевіч, Н. Гейц, Р. Шмыроў, М. Зінкевіч.

Рэжысёр спектакля — народны артыст БССР Л. Рахленка.

На здымку—сцэна са спектакля. У ролях (справа налева): Зёлкін — Б. Платонаў, Левановіч — Р. Філіпаў, Гарелахвацкі — Л. Рахленка, удзельніца пасяджэння — М. Зінкевіч.

ТЭАТР НА ГРОДЗЕНСКІХ ПРЭМ'ЕРАХ

Георгій КОЛАС,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»

Штодзённыя афішы Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра ў той тыдзень запрашалі гледачоў на два спектаклі—інсцэніроўку аднайменнага апавядання Б. Лаўранёва «Простая рэч» і драму В. Лаўрэнцьева «Шануй бацьку свайго». Гэтыя назвы чаргуюцца тут з дня на дзень. Праўда, на гарадскіх шчытах сустрэнеш і «Порт-Артур», і самога Шэкспіра—«Антоній і Клеапатра», і шмат што іншае. Аднак на сцэне яны не ідуць. Тлумачыць гэта нізкай вартасцю спектакляў было б няправільна. Мы бачылі іх улетку на гастролях у Мінску, бачылі і да гастроляў і пераканаты, што «Порт-Артур» — адна з лепшых прац тэатра за многія гады, а што датычыць «Антонія і Клеапатры», дык і тут, нягледзячы на многія пярэчанні, ёсць шмат цікавага (на жаль, цяпер не «ёсць», а ўжо—«было»).

Што ні кажы, а мусіш згадзіцца з кіраўнікамі тэатра, калі яны са шкадаваннем спасылаюцца на горад: мала гледачоў. І ўжо калі такія буйныя палотны не выжываюць больш сезона, дык дзе там пратрымацца «Пятроўцы, 38» альбо «Бялявай бестыі», якія былі пастаўлены не так даўно і ўжо сканалі. Ды і не на іх рабіў тэатр галоўную стаўку ў рэпертуары новага сезона. Надзеі ўскладаліся на п'есу «Паміж ліўнямі», якая ішла ўжо ў Маскве, на сцэне Тэатра імя Ул. Маякоўскага, і ў Гродна не маглі прадбачыць, што драматург А. Штэйн часова закансервіруе свой твор, узяўшыся за дапрацоўку. Вядома, для маскоўскай сцэны гэта не так страшна, як для Гродна, дзе страта амаль гатовага спектакля выбівае з рытму калектыў на ўвесь сезон.

Каб перадаць карціну напружанага жыцця тэатра ў Гродна, я хацеў бы прывесці распарадак дня (ці нават двух з тых чатырох, калі мы былі там) мастацкага кіраўніка, заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР А. Струніна.

Сустрэча першая—у тры гадзіны дня. Ён ужо скончыў ранішнюю рэпетыцыю, забег у кабінет дырэктара, каб узгадніць арганізацыйныя пытанні і адразу ж адправіўся з часткай калектыву на выезд у Друскенікі са спектаклем «Простая рэч». Вярнуліся апаўночы, а другой гадзіне. У дзесяць раніцы зноў рэпетыцыя. На другі дзень, зноў у тры, новы выезд. І—гэткае ж вяртанне. Назаўтра...

А калі выезду няма—таксама палёгкі не чакай. Тэатр адначасова працуе над трыма прэм'ерамі. Адсюль—занятасць, празмерная загружанасць усіх—ад галоўнага рэжысёра да артыста дапаможнага складу.

Не бяруся пералічваць тых важных спраў, якія складаюць штодзённы клопат кожнага тэатра. Не буду паўтараць і слоў аб неабходнасці культурнага самаўдасканалення артыста, мастака і рэжысёра. Скажу адно: ва ўмовах Гродна ўсё гэта складаней, чым у Мінску.

Вось тут і паўстае пытанне: па якім рахунку весці размову аб спектаклях, якія нам давялося бачыць,— з улікам складаных умоў іх нараджэння і сцэнічнага жыцця альбо...

...БЕЗ КАМПРАМІСАЎ.

Так, без кампрамісаў, мы гутарылі (я і мой сябра, адзін з нашых паэтаў) з галоўным рэжысёрам напярэдадні ад'езду з Гродна. Аляксандр Пятровіч толькі што разгрымураваўся. У «Простай рэчы» ён іграе следчага асобай камісіі Тумановіча. Іграе стрымана, тактоўна і нават драматычна. Праўда, вельмі неставала ў сцэнах белагвардзейца Тумановіча з паланёным чэкістам Арловым усхлёсту ідэйных сутыкненняў, нейкай кульмінацыі. І выканаўца (ён жа рэжысёр, і ён жа аўтар ...сцэнічнай вядомага апавядання Б. Лаўранёва) А. Струнін згадзіўся, што паядынак паміж імі павінен быць. А зараз, пішучы артыкул, я прыгадваю патухлы голас, апушчаныя плечы струнінскага Тумановіча, і мне здаецца, што ў чымсьці наша ўспрыняцце вобраза ішло ад штампа,—маўляў, калі на сцэне ворагі, дык абавязкова іх трэба сутыкнуць у антаганізме светаглядаў.

У Тумановіча ёсць фраза:

— Я хацеў бы ад свайго лёсу,— кажа ён Арлову,—каб у дзень, калі мне давядзецца паміраць за маю справу, каб мне была паслана гэткая ж трывала...

Я чую, як на ...ладаванням, горыччу ... фраза, і я не ... словы «за ма... і былі, іх ... строенасць дамленнем ...ця. Вось ... вынікае ... ўсіх пав... віча? І ... вым св... ў Б. ... ра—«... прыт... цэсу ... «пра... не ... вы... ка... ду... ві... тр... з...

Паэтычная паверка

Міхась РУДКОЎСКІ

ПАКЛІЧ МЯНЕ...

Пад цёплым снегам травы
баравыя,
на голлі хвой і сініх вязаў снег...
У царства чыстай цішыні, Марыя,
пакліч мяне і забяры мяне, —

дзе ў леснічоўцы вымыта
падлога,
абрус бялютка-белы на стале,
дзе за старой павеццю, каля
стога,
жуе мурог няпуджаны алень.

Я не пакрыўджу вольнай пушчы
сына,
я не пралью ягонае крыві.
Я нават слова бруднага не кіну
у чысціню аснежных баравін.

Пакліч! Ці хоць дашлі ў пісьме
сняжынку,
адну сняжынку з светлых
тых мясцін...

Юрась СВІРКА

ДОМ РОДНЫ

Есць у кожнага свой
Незабыўны, абжыты куток,
Дзе ніколі не страшны
Ніякія спёкі і сцюжы;
Дзе з калодзежа возьмеш
Гаючай вадзіцы глыток—
І адчуеш сябе
Маладым, і шчаслівым, і дужым.

Кожны помніць свой ганак,
Пад ім наматана клубкамі дарог
І прыціснута камнем,
Што некалі трушчыў зярняты.
І калі ты аслаб,
І калі ты ў дарозе знямог,
То вяртайся на гэты парог —
Тут для рук тваіх
Будзе спачын і занятак.

Зноў я дома жыву...
Родны двор, родны дом!
Як я рад, што сюды
Прывяла мяне сцежка прамая.
Бацькаў двор,
для мяне ты—
Аэрадром,
Што ў любое надвор'е
прымае.

Алег ЛОЙКА

ЧАМБАР

Жылі чамбарскія мяшчане —
Санлівасць, млявасць з-пад павек,
Масцілі тратуар дашчаны
З дубоў стагодніх, каб навек.

Дуб чорны — у падрубу клалі,
А на падлогу — белы дуб,
І ледзь фундаменты трымалі
Грувастка вычасаны зруб.

І герб займелі ад напасці —
Снапы ў бланіце ў тры рады
І журавель як сімвал шчасця,
Зняволенага назаўжды.

Трашчалі гумны ад пшаніцы:
За ўласны кошт, а не з казны
Узнеслі гэтнія званіцы —
За вёрстаў сто былі відны!

Стараліся, каб цар у госці
Прыехаў — ашчаслівіў іх.
І вось ён, хмельны з весялосці,
Прымае дар рабоў сваіх.

Тры бочкі рыбы адмысловай,
Што водзіцца ў адной Суры,
Яму націлі,
І галовы
Схілялі:
— Родны наш, бяры!..

І цар сказаў ім пры ўсёй свіце:
— Дары дастойна ацаню.
Чаго захочаце — прасіце:
Усё чамбарцам учыню!..

Яшчэ ніжэй сагнулі спіны,
Руку цалуючы яму:
— Заступнік, бацька наш адзіны—
Збудуй у горадзе турму!..

Муроў халодных строй панылы
Устаў, чакаючы ахвяр, —
Ды ўжо ў сталіцу, поўны сілы,
Бялінскі выязджаў з Чамбар.

Знікалі ў далечы званіцы,
Глухая царская турма,
З якой яму давеку біцца,
Народ выводзячы з ярма!..

Сярод кніг

ПРАСТАТА І СПРОШЧАНАСЦЬ

Адсутнасць дапаможніка па тэорыі літаратуры на беларускім матэрыяле даўно адчувалі настаўнікі, студэнты, усе тыя, хто цікавіцца асновамі навукі аб літаратуры. Таму з пачуццём задавальнення бярэш у рукі кнігу М. Лазарука і А. Лянсу «Пытанні тэорыі літаратуры».

Аўтары дапаможніка сутыкнуліся, бясспрэчна, з вялікімі цяжкасцямі. Адрасуючы сваю працу настаўнікам і студэнтам, яны імкнуліся «зрабіць першы крок, першую спробу стварэння кнігі, дзе асноўныя пытанні тэорыі раскрываліся б галоўным чынам на матэрыяле беларускай літаратуры». Трэба было папулярна і цікава расказаць аб вельмі складаных літаратурных з'явах і ў той жа час не паўтараць таго, што напісана ў кнігах па тэорыі літаратуры рускімі аўтарамі.

М. Лазарук і А. Лянсу разглядаюць важнейшыя пытанні практыкі і тэорыі літаратуры: літаратура і жыццё, прадмет літаратуры, партыйнасць і народнасць літаратуры, змест і форма, мова мастацкага твора, вершаскладанне, паэтычныя роды і віды і г. д.

У кнізе ў асноўным удала выкарыстоўваюцца багацейшыя факты беларускай мастацкай літаратуры. Аналізуючы літаратурныя з'явы, аўтары робяць пераканаўчыя тэарэтычныя вывады, абагульненні.

Кваліфікаваная размова аб вобразе-характары, літаратурным тыпе, аб прынцыпах, спосабах раскрыцця чалавечага характару пісьменнікамі розных эпох, розных творчых метадаў вядзецца ў раздзеле «Змест і форма мастацкага твора». Праўда, можна не згаджацца з самім азначэннем «вобраз-характар». Многія савецкія літаратуразнаўцы лічаць, што паняцце характару больш вузкае, чым паняцце вобраза чалавека, героя. «Характар у адносінах да вобраза выконвае ролю ядра ў адносінах да клеткі» (Л. І. Цімафееў); ён не ахоплівае біялагічных і фізіялагічных рыс чалавека, яго партрэта і г. д., хаця, безумоўна, у мастацкім творы і яны ў той або іншай ступені характарызуюць, выражаюць ідэйна-эстэтычныя адносіны аўтара да асобы.

На нашу думку, плённым з'яўляецца падыход аўтараў да сюжэта як да мастацкага сродку «раскрыцця характараў у адпаведных жыццёвых абставінах». Гэта палажэнне пераканаўча абгрунтоўваецца разглядам сюжэта п'есы К. Крапівы «Хто смяецца апошнім».

Даволі шырокі погляд у аўтараў дапаможніка на кампазіцыю мастацкага твора. Падрабязны, усебаковы аналіз кампазіцыі паэмы Я. Коласа «Рыбакова хата» дазваляе ім зрабіць наступны шырокі вывад: усе асаблівасці кампазіцыі «строга абумоўлены, вызначаны ідэйнай задумай твора, яго ідэйным зместам. Гэтая строгая абумоўленасць і робіць кампазіцыю кожнага значнага твора мастацкай літаратуры арыгінальнай і непаўторнай...» Не выпадаюць з поля зроку М. Лазарука і А. Лянсу і кампазіцыя літаратурных характараў, вобразаў, і сувязь кампазіцыі з сюжэтам, і іншыя пытанні.

Большасць тэарэтычных пытанняў даследчыкі імкнуліся разгледзець у гістарычным аспекце, выяўляючы гістарычныя карэнні той або іншай літаратурнай з'явы. Гэта радуе. Праўда, гістарычны прынцып праводзіцца не зусім паслядоўна.

Аднак радасць ад сустрэчы з кнігай гасне, становіцца няпоўнай, калі паступова пачынаеш заўважаць, што прастата і даходлівасць выкладання часам ператвараюцца ў аднабаковасць і спрошчанасць тэарэтычных абагульненняў, вывадаў, азначэнняў. І хочацца выказаць шэраг істотных заўваг.

На невысокім тэарэтычным узроўні напісаны першы раздзел — «Літаратура і жыццё». Тут вельмі мала арыгінальнага матэрыялу, многія прыклады і азначэнні ўзяты напракат з рускіх кніг па тэорыі літаратуры. Дужа шмат цытат. Слабей выкарыстоўваюцца ў гэтым раздзеле і факты беларускай літаратуры, яны часам як бы «падвешваюцца» да агульнавядомых прыкладаў з рускай і зарубежнай літаратуры.

Аўтары дапаможніка чамусьці пазбягаюць тэрміна «творчы метад», ужываюць замест яго тэрмін «напрамак», хаця гэтыя паняцці азначаюць не адно і тое ж. Не разглядаючы спецыяльна пытанняў творчага метаду, М. Лазарук і А. Лянсу так тлумачаць прычыны ўзнікнення таго або іншага літаратурнага метаду: «На аснове агульнасці ўяўлення аб прыгожым для людзей аднаго сацыяльнага асяроддзя і гістарычнай эпохі і ўзнікаюць розныя напрамкі ў мастацтве і літаратуры: класіцызм, рамантызм, сацыялістычны рэалізм». Такое вытлумачэнне з'яўляецца аднабаковым, бо тут не ўлічваюцца поўнасцю такія фактары, як асаблівасці канкрэтна-гістарычных, сацыяльных умоў, сутнасць новага для кожнага метаду героя, характар сацыяльнага і эстэтычнага ідэалу.

Недастаткова глыбокае разуменне сутнасці трагічнага як эстэтычнай катэгорыі, нейкая як бы боязь самога гэтага тэрміна выяўляецца ў аўтараў пры аналізе апавядання М. Лынькова «Васількі».

Думаецца, не варта па старой інерцыі залічваць А. Рыпінскага і Я. Баршчэўскага ў лагер дваранска-буржуазных пісьменнікаў, якія як быццам бы насміхаліся з простага чалавека, паказвалі яго «нядбайным, дзіваком, п'яніцам і г. д.». Новыя матэрыялы, якія з'явіліся ў нашым друку, абвяргаюць гэта.

Не жадаюць чамусьці аўтары выяўляць і сваё прынцыповае стаўленне да літаратурнага жыцця, літаратурнай барацьбы 20-х гадоў. Вядома, прасцей за ўсё ехаваецца за кнігі Ю. Пшыркова і Н. Перкіна. Вельмі «сарамліва» гавораць даследчыкі аб вульгарным сацыялагізме: «Былі ў беларускай літаратурнай крытыцы і праяўленні вульгарнага сацыялагізму, у прыватнасці ў выступленнях Л. Бендэ і інш.». І—ні слова аб шкодзе, якую ён прынёс нашай літаратуры.

Спрошчаным і проста несур'ёзным з'яўляецца азначэнне: «У асобным мастацкім творы да зместу звычайна адносяцца тэма і ідэя, а да формы—кампазіцыя і мова». Праўда, далей аўтары слушна адзначаюць, што «ўзаемасувязь паміж зместам і формай у мастацкім творы ўяўляе сабой складанае адзінства», што не ўсе кампаненты твора так лёгка аднесці толькі да зместу або формы. Сапраўды, вобраз героя, літаратурны характар—і змест, і форма мастацкага твора. Яны—і аб'ектыўная новая рэальнасць, створаная пісьменнікам, і адначасова інструмент, форма адлюстравання, пазнання жыцця.

Памылковымі з'яўляюцца сцвярджэнні: «Вершаваная мова, верш—заўсёды лірычныя...» (А як быць з эпічнай паэмай, байкай і інш.?!); «Быў час (XVIII стагоддзе—П. Д.), калі літаратурная мова... ўжывалася толькі ў сялянскім асяроддзі» (у сялянскім асяроддзі ўжывалася народная, размоўная мова—П. Д.).

Вельмі ж просталінейна звязваюць аўтары метад, светапогляд пісьменніка са своеасаблівасцю тропаў, якімі ён карыстаецца, перабольшваюць іх значэнне: «І ў гэтай клетачцы (мастацкім тропе. — П. Д.) можна знайсці некаторыя характэрныя асаблівасці літаратурнага твора ў цэлым і нават больш—асаблівасці творчасці пісьменніка, яго стылю, метаду, светапогляду». Прасталінейна вырашаецца і праблема галоўнага героя твора і аўтара: «Успомнім «Яўгенія Анегіна» Пушкіна або сучасную сатырычную камедыю К. Крапівы «Мілы чалавек», дзе выведзен вобраз аўтара камедыі, журналіста Язвы, які ў працэсе дзеяння збірае матэрыял для свайго твора, і да т. п.»

Нам здаецца спрэчным і падзел літаратуры на чатыры, а не тры паэтычныя роды, выдзяленне асобна ліра-эпічных твораў (паэма, баллада, байка). Мабыць, тут мы маем справу з такімі паэтычнымі жанрамі, на якія вельмі адчувальна робіць уплыў працэс узаемапранікнення элементаў аднаго роду і жанру ў другі. Хацелася б бачыць у раздзеле пра жанры больш грунтоўнае высвятленне спецыфічных прыкмет рамана, аповесці, апавядання. Аўтары ж не пайшлі далей звыклага школьнага вызначэння: раман—жанр «самы буйны і складаны», аповесць—«сярэдняя эпічная форма», апавяданне—«малая эпічная форма».

Кідаюцца ў вочы і стылістычныя недакладнасці, памылкі. Вось некалькі прыкладаў: «Яе (літаратуры—П. Д.) паэтычнае слова злівалася з вызваленчай барацьбой народа»; «Дзякуючы адзінству нацыянальнага пачатку і вялікага мастацкага вопыту лепшых твораў сусветнай літаратуры іх (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча—П. Д.) паэзія і заняла такое значнае месца ў развіцці беларускай літаратуры»; «У стварэнні літаратурнага характару пісьменнік выкарыстоўвае разнастайныя мастацкія сродкі. Такімі сродкамі, у прыватнасці, з'яўляюцца знешнасць героя, абставіны і асяроддзе, якое акружае яго...» Не ўпрыгожваюць кнігу такія русізмы, як «ізображэнне», «небесстаронняе» і г. д.

Усе гэтыя недахопы, безумоўна, значна зніжаюць вартасць патрэбнай кнігі.

М. Лазарук і А. Лянсу ў сваім дапаможніку не разглядаюць такія важнейшыя праблемы, як літаратурны напрамак, метад, стыль і інш., і абяцаюць: «Гэта, магчыма, будзе распрацавана пазней...» Будзем спадзявацца, што працягнуць яны працу і па паглыбленню ўжо выдадзенай кнігі.

Павел ДЗЮБАЙЛА.

М. А. Лазарук, А. Я. Лянсу «Пытанні тэорыі літаратуры». Выдавецтва «Народная асвета», 1964.

ЖЫЦЦЁ—НЕ ВЫКЛЮЧНЫЯ ВЫПАДКІ

Зборнік нарысаў і апавяданняў М. Грыцана «Выключны выпадак» адкрываецца нарысам «Сястра мая, палачанка!» — пра слаўную дачку беларускага народа Героя Савецкага Саюза Тусналобаву-Марчанку. Аўтар цікава, дакладнымі штрыхамі і дэталямі малюе партрэт гераіні. Ён крок за крокам раскрывае перад чытачом вытокі і глыбіню подзвігу Зінаіды Міхайлаўны. Нарыс напісаны з добрым пачуццём усхвалявання і цеплыні.

Тым большую прыкрасць адчуў я, калі адразу ж пасля гэтага нарыса прачытаў апавяданне «Сыны». Тут аўтар нібы паставіў перад сабой задачу: выціснуць у чытача слязу. Кожным радком ён нібы гаворыць нам: глядзіце, якой ледзь не ўсенародны павагай акружана Ганна Паўлаўна, якая яна ледзь не святая. У выніку атрымалася не надзеленая жывымі рысамі маці-гераіня, а пазбаўлены прыкмет жыцця абраз.

Гэтае імкненне да іканапісу адчуваецца і ў некаторых іншых апавяданнях зборніка. І яшчэ адну непажаданую з'яву заўважаеш у асобных творах празаіка: імкненне будаваць іх на адной-адзінай дэталі. Адкінь гэтую дэталь — і апавяданне разбураецца. Так, у «Маслінах» гэтую выратавальную ролю адыгрываюць ягады паўднёвай расліны; у «Вішаньцы» — кошык з вішнямі; у «Пісьме з Расіі» — скінуты з балкона гаспінічнага нумара канверт.

Ну, а калі б маслін не было? Калі б дрэўца, перасаджанае салдатамі на ўчастак дзеда Яўсея, не прынесла вішань? Калі б доктару Фрэнкелю (дарэчы, вельмі нехарактэрнае для немцаў прозвішча) не ўздумалася напісаць пісьмо чалавеку, якога, «можа быць, ужо няма на свеце»? Ці з'явіліся б у М. Грыцана названыя апавяданні?..

Праўда, ёсць у зборніку і добрыя, праўдзівыя і шчырыя апавяданні: «Віцькава ёлка», «Стажыроўка», «Выключны выпадак», «Асенні вецер». Адчуваецца, што М. Грыцан пісаў іх не з аглядкай на будучага крытыка, а з пачуццём любві і павагі да людзей, якія жывымі і паўнакроўнымі героямі паўстаюць са старонак гэтых апавяданняў. У іх аўтар здолеў раскрыць унутраны свет герояў, іх маральную сілу і душэўнае багацце. Мы бачым, менавіта бачым, шчырага, чалавечнага капітана Камарова, падзяляем горыч і няўдачы лётчыка Сяргея Рабцава, нам блізкія і зразумелыя пачуцці, якія прымушаюць лётчыка Талчэнава ісці на «выключны» выпадак у авіяцыі, мы не можам не палюбіць «паветранага рэмізніка» Удалава, які ахвяруе сваёй запаветнай марай дзеля таго, каб выратаваць жыццё незнаёмага чалавека.

У М. Грыцана, маладога празаіка, свая тэма: мірныя будні ваенных лётчыкаў. У гэтым кірунку і хочацца пажадаць яму поспехаў. Аднак трэба перасцерагчы М. Грыцана ад іканапісу, ад сентыментальнай сусальнасці, ад выдуманых дзеля эфектнай канцоўкі маслін, вішань і безадрасных пісем, — ад усяго таго, што ідзе не ад жыцця, а ад імкнення зрабіць апавяданне «закручанае», «інтрыгуючае».

Аляксандр МІРОНАЎ.

М. Грыцан «Выключны выпадак». На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1964.

НАТХНЁНЫЯ ПЕСНІ

Калі б жыў Уладзімір Хадыка, яму пазаўчора споўнілася б шэсцьдзесят гадоў. Толькі б шэсцьдзесят...

Нарадзіўся ён на Чэрвеньшчыне, у вёсцы Цітва. З дзіцячых гадоў зазнаў нямала гора. Беднасць і сіроцтва вадзілі яго па няроўных, жарсцяных дарогах і ў юнацтве. Не соладка кармілі яго за чужым сталом, бо, як сам ён любіў часта паўтараць: «Батрачы хлеб—сабачы».

Свет для сялянскага хлопчыка адкрываўся праз кнігі. Яшчэ будучы вучнем Дудзіцкай пачатковай школы, ён захапляўся вершамі Пушкіна, Лермантава, Цютчава. Музыка слова запала ў яго душу і запаланіла на ўсё жыццё. Старэйшая сястра паэта Люба Мартынаўна ўспамінае:

«Уладзік вельмі любіў чытаць кнігі. З малых гадоў усё чытаў і чытаў. Кніжкі ён даставаў у вясковай інтэлігенцыі. Часта хадзіў у Чэрвень і на свае маленькія зберажэнні ад продажу ягад і венікаў купляў кніжкі. Такім чынам у яго завялася невялічкая ўласная бібліятэчка, якая акуратна захоўвалася ім як найдаражэйшы скарб...»

У першыя гады Савецкай улады ўсюды пачалі адкрывацца новыя школы. Не хапала настаўнікаў. У Мінску адкрыліся агульнаадукацыйныя курсы. Вучыцца на іх паступіў і Уладзімір Хадыка. Пасля ён працаваў настаўнікам у вёсцы Асака Дудзіцкага сельсавета Рудзенскага раёна. Часта да позняй ночы не гасла святло ў акне настаўніцкага пакою. Познія госці настаўніка—вершы. Першыя спробы пяра, першыя радасці і хваляванні:

Добры ветрык, сукаючы
кужаль,
Вывучае вякоў альфабэту.
Каб аславіць, чытаючы дужа,
Раніцовыя вершы паэта.

Дрэва мудрасці вечнае ў слове,
Не гніе пад пяском і вадою...
Напішу я такую аповесць,
Хоць сівой абрасту барадою...

У 1924 годзе малады настаўнік ідзе ў Чырвоную Армію. У час службы ў горадзе Навазыбкаве напісаны ім не адзін дзесятак вершаў, якія ў 1926 годзе выйшлі асобнай кніжачкай у серыі бібліятэчкі «Маладняка» пад назвай «Суніцы». У Навазыбкаве, у армейскай бібліятэцы, Уладзімір Хадыка знаёміцца з творчасцю Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аляксандра Блока, Сяргея Ясеніна, Барыса Пастэрнака. Ён прагна ўбіраў усё новае ў паэзіі, што кранала яго душу, дапаўняла і пашырала яго паэтычны арсенал.

Пасля службы ў арміі Хадыка працуе рахункаводам і сакратаром Дудзіцкага сельсавета. Кожную вольную хвіліну ён аддае вершам, якія ўсё часцей і часцей друкуюцца ў розных газетах і часопісах.

1928 год быў асабліва значным у творчай і жыццёвай біяграфіі паэта. Ён пераязджае на сталае жыццё ў Мінск, пачынае працаваць у часопісе «Полымя». Праца ў рэдакцыі зблізіла Уладзіміра Хадыку з тагачасным літаратурным жыццём, пашырыла кола яго знаёмстваў з беларускімі літаратарамі. Чытанне чужых рукапісаў навучыла яго больш патрабавальна ставіцца і да сваёй працы. Усё гэта спрыяла яго творчаму росту. Мінавіта ў гэты час з'яўляюцца яго радкі:

Нервамі ўпрагуся,
Словы з сэрца выкіну,
Калі вызнаць мусяць
Таннае пілікание.

І на жудасць скрухі,
Цераз край адужаны,—
Не кранусь слухаць
Хлюпат бруднай лужыны.

Ён дакляраваў, што песня яго будзе «пачуццём паэта, думкай грамадзяніна».

Праўда, былі ў паэта і зрывы, ён трапляў часам у палон моўнай стыхіі, захапляўся знешнімі атрыбутамі паэзіі. Ад гэтых зрываў яго спрабавала лячыць тагачасная крытыка, часцей за ўсё «рапаўскай дубінкай». З'яўляліся артыкулы, у якіх нават гаварылася, што Хадыка дакаціўся да «кантыянскага агнастыцызму».

Але большасць яго вершаў былі здабыткамі сапраўднай паэзіі, у іх было шмат лірычнага пачуцця і шчодрых думак, якія знаходзілі дарогу да чытача. Прайшлі гады, а я і сёння з асалодаю чытаю:

Даруй за слова грубае.
Прабач за крыўды круг,
Адзіная і любая,
Мой свет, мой мудры друг,

Ты ў снах, што з морам
спеліся,
Невыпадковы госць...
Сябры нідзе не дзеліся
І скарбы шчасця ёсць.

Нашу я радасць гэтую,
Як па табе нуду,
Гарну з-пад сонца гэтую
Салёную ваду.

Каб свет шумеў, як некалі
Дзяцінству чараты,
Каб залатымі рэкамі
Мне слала пісьмы ты.

Ды ці толькі гэта!.. Не забудуцца і не састарэюць вершы «Пароша», «З дарогі», «Абрысы старадаўняй пушчы», лірычны цыкл «З поўдня», цыкл «За строем дат і рубрык», «Пяць вершаў» і многія, многія іншыя... Яны—лепшае сведчанне таго, што аўтар іх быў паэтам таленавітым, майстрам паэтычнай думкі, адданым сынам сваёй Радзімы. Ён любіў сардэчнай любоўю родную зямлю і славіў яе:

Цябе адлюдні звалі дзікаю,
Ты ж наша моц на роспач
злую:
Ўзрасла адзіная, вялікаю
І не знайсці нідзе другую.

Краямі спосаб твой паўтораны,
Падхоплен спеў жывы
і складны.
Згуртаваны народ, каторому
Зямля і неба падуладны.

Праз язвы ран зямлі балючыя,
Над пушчамі вякоў
распусных,—
З высокім імем—Рэвалюцыя —
І з іменем тваім на вуснах.

Уладзімір Хадыка прайшоў кароткі, але вельмі складаны творчы шлях. Ён меў вялікія здольнасці, у яго быў, як кажуць, «божы дар»—паэтычны талент, тонкае адчуванне паэтычнага слова. Ён быў адданым слугой паэзіі і не шкадаваў сіл і працы для таго, каб яна раскрыла перад ім усе таямніцы.

Жорсткая рука спыніла дбайны паэтычны поступ. У часы культу асобы Сталіна Уладзімір Хадыка трагічна загінуў. Нашчадкі не забудуць яго творчых здабыткаў. Яны возьмуць у дарогу да будучыні яго натхнёныя песні.

Мікола ХВЕДАРОВІЧ.

ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ХАДЫКІ

тым,—пакуль што, праўда, толькі самому сабе. Ён па інерцыі выконвае «працэсуальныя» функцыі следчага-белагвардзейца. А ў душы яго — боль, пакута. І—павага, зайздрасць да чэкіста Арлова з яго моцнай, мацнейшай за смерць, любоўю да Расіі.

Натуральна, што такі вось Тумановіч не кідаецца ў ідэалагічны паядынак з Арловым. Што ж датычыць згоды выканаўцы адшукваць месца для такога сутыкнення, дык яна была, напэўна, з яго боку кампрамісам, і я таму здаюся ўсе свае довады, што прымусілі А. Струніна пайсці на кампраміс.

«АРЫСТАКРАТЫЧНЫ» СУМ

Іншая справа—вобраз галоўнага героя, чэкіста Арлова. Тут, шчыра кажучы, паўнейшая няўдача. Ні ў вонкавым абліччы, ні ў паводзінах, ні ў чым іншым заслужаны артыст БССР В. Грачынскі не здолеў перадаць ніводнай з істотных рыс таго жывога, непаўторнага чалавека, які ў апавяданні то паддаецца інтэлігенцкай рэфлексіі, то паўстае нязломнаю асобай. Тое, што іграе выканаўца, па[illegible] канкрэтнасці. Вось, ск[illegible]ах канспірацыі [illegible] французскага [illegible]юр'е. В. Гра- [illegible] і ўвесь свой [illegible] каб выгля- [illegible] чым тут [illegible] і бадзяец- [illegible]таў? І ці [illegible]м, абра- [illegible]асноўнай [illegible]кую вы- [illegible] і Арлоў [illegible] і фран- [illegible]нку» з [illegible] беспа- [illegible]аба бе- [illegible]кі аб [illegible]шмат [illegible] ва- [illegible]ж- [illegible]ы [illegible]

Так напісана ў Б. Лаўранёва. Цудоўны жывы партрэт! А на сцэне замест яго—апліўраваная мумія іншаземца-арыстакрата «наогул», з адбіткам суму на твары.

І вось такі «арыстакрат» сядзіць у «Алімпе» і «расчараванa» выслухоўвае ніцшэанскія тырады паручыка Сабалеўскага, якія той вымаўляе зноў-такі, відаць, ад суму. А тут яшчэ раманс—«Я вспомнил вас и всё былое...»

Застылая, статычная, сумная сцэна. Ніякага напружання, ніякай барацьбы. А тут жа сустрэліся два таленты, два розумы, два светы. Абодва—Арлоў і Сабалеўскі—спрактыкаваныя майстры разведкі. Ідзе затоены турнір, пасля якога пераможаны Арлоў, напярэдадні смерці, напіша пра свайго праціўніка: «Цудоўны артыст... Пераіграў мяне...»

Шкада, што ў гэтай сцэне В. Грачынскі, як партнёр са стажам і вопытам, падначаліў сабе і павёў у «сум» маладога выканаўцу ролі Сабалеўскага В. Рубана. Шкада таму, што Рубан мае ўсе падставы, каб шматгранна ўвасобіць вельмі моцны і цікавы вобраз. Пакуль што ёсць Сабалеўскі—люты чалавеканенавіснік. Адчуваецца таксама інтэлектуальная «ўзброенасць» Сабалеўскага. Мы верым, што гэты чалавек выхоўваўся ў Сарбоне, чуем, як натуральна гучыць у яго вуснах Верлен. Ён—сапраўдны кадравы афіцэр і перакананы, ідэйны вораг рэвалюцыі. Усяго гэтага—нямала. Аднак у тым партрэце, які стварае малады артыст В. Рубан, няма натуры дзейснай, няма разведчыка. Ён з'явіцца тады, калі паручык будзе не проста выказваць «у паветра» свае погляды, а праз іх, праз тое, як яны ўздзейнічаюць на людзей—і выявяць, хто перад ім: «французік» альбо хто іншы...

Але вернемся да Грачынскага—Арлова. Пасля арышту ён зноў альбо «сумуе», альбо іграе пагарду і нянавісць да белагвардзейцаў. Зноў—статычнасць. А патрэбна — дзеянне. Якое? У Арлова ёсць адно, галоўнае імкненне: дасягнуць таго, каб сапраўдныя абставіны яго арышту праніклі да рэўкома праз краты. У імя гэтага ён цкуе сваіх следчых наўмысна грубасцю, спадзеючыся, што [illegible]ны не вытрымаюць дзёрзкасці, і сам [illegible]т яго смерці на дольше з'явіцца пацвярджэннем таго, што ён не здаўся ім добраахвотна. У імя гэтага ён кідаецца праз акно, каб быць хаця б забітым у час уцёку, бо надзеі на поспех справы амаль няма. У імя гэтага ён просіць Тумановіча прыкласці да следчай справы свае пасмяротныя нататкі і адмаўляецца ад атруты. У імя справы ён робіць усё, каб смерць яго была дзейснай, а не пасіўнай. А ў В. Грачынскага ўсё гэта (цкаванне следчых, рызыка ўцёку і інш.) выглядае вынікам рэфлексіі і патыхае авантурызмам.

АДКУЛЬ «ТРЭСКІ ЛЯЦЯЦЬ»?

Вінаваціць ва ўсім толькі выканаўцу ролі В. Грачынскага было б несправядліва. На трактоўцы вобраза адбілася памылковая, на наш погляд, канцэпцыя А. Струніна, з якой ён падыходзіў да інсцэніравання і пастаноўкі апавядання Б. Лаўранёва.

У сцэне Арлова і Бэлы наш слых разанула адна фраза. Арлоў, даведаўшыся, што замест яго арыштаваны нейкі невядомы, ні ў чым не вінаваты двайнік, хоча пайсці да белякоў і зданца, каб выратаваць «мужычонку». Бэла яму пярэчыць:

— Лес сякуць...

— Трэскі ляцяць?..—абурана пытаецца Арлоў, не даўшы ёй дагаварыць.

Не цяжка здагадацца, куды цэліць гэтай фразай (яе няма ў Б. Лаўранёва) інсцэніроўшчык. Але такая «перасадка» праблематыкі апавядання, пабудаванага на гістарычных сітуацыях часоў грамадзянскай вайны, у абстаноўку, што склалася ў краіне праз чвэрць стагоддзя, пярэчыць усёй канструкцыі, ідэі твора. Яе ніякім чынам не раскрыеш праз дзеянне. Вось і даводзіцца артысту «перажываць» яе, і гэтае «перажыванне» пры ім і застаецца, не пераносіцца праз рампу да гледача. Хочацца дадаць: і добра, што не пераносіцца. Інакш спектакль сцвярджаў бы ідэю, адваротную ідэі Лаўранёва. Часовыя ваганні галоўнага героя ён асвятліў бы німбам абстрактнай гуманнасці, а рэвалюцыйны гуманізм і прынцыповасць Семянухіна тут прыраўняліся б да страшнай і злачынай практыкі культаўскага часу.

На шчасце, сама прырода сцэнічнага мастацтва аберагла тэатр ад небяспекі: сюжэт з інтрыгай перапісаны ў «Алімпе» выглядаў ні больш, ні менш як перафразам інтэлектуальнага паядынку Раскольнікава са следчым Парфірыем Пятровічам).

Ні «дастаеўшчыны», ні захаплення дэтэктыўнасцю ў гродзенскай пастаноўцы няма. Яна ўспрымаецца як расказ пра мужнасць людзей-барацьбітоў за ідэалы рэвалюцыі. Што ж датычыць эмацыянальнай танальнасці і дзейснага ўплыву на гледача, дык, нам здаецца, яны ўзрастуць, калі тэатр уважліва, крытычна перагледзіць лінію галоўнага героя, актывізуе яго паводзіны, зыходзячы не з адцягненых уяўленняў, а з канкрэтных абставін рэчаіснасці, адлюстраванай аўтарам.

Астатняе—трактоўка іншых вобразаў, сюжэтная будова, афармленне мастака М. Гафта—без асаблівых агаворак можа быць прынята як адпаведнае задуме лаўранёўскага апавядання. Праўда, мы раілі б інсцэніроўшчыку падкарэціць сцэны ў доме Сакаўніных (адзначым: дарэчы, выканаўцаў — заслужаных артыстаў БССР М. Кавязіну і Я. Кімберга). У ролі Бэлы хацелася б заўважыць больш тонкую грань паміж яе сапраўдным непакоем аб лёсе арыштаванага Арлова і «заканспіраванымі» пачуццямі падпольшчыцы, хаця ў цэлым Л. Сторажава стварае цікавы вобраз. Нарэшце, даволі спрэчным нам уяўляецца тое, што тэатр прымусіў старшыню рэўкома Семянухіна ў час прыходу белых працаваць дантыстам, не паклапаціўшыся нават аб лёгкай змене свайго аблічча. Гэта—недаравальны «ляпсус» інсцэніроўшчыка (а не зусім удалы выбар выканаўцы — А. Царова падкрэсліў гэты «ляпсус»)...

* * *

Перш чым перайсці да размовы аб другой рабоце тэатра, хочацца адзначыць, што пастаноўка «Простай рэчы» выклікала жывую зацікаўленасць і спрэчкі ў гледачоў і ў калектыве. Таму мы і спыніліся на ёй падрабязна. Хочацца, каб праца над спектаклем працягвалася і, каб ён надоўга застаўся на афішы сярод тых назваў, якія з'явяцца пазней, папоўніўшы сабою цяперашні рэпертуар.

А пра другую пастаноўку—«Шануй бацьку свайго»—у артыкуле наступным.

АБМІНАЮЧЫ «ДАСТАЕЎШЧЫНУ» І ДЭТЭКТЫЎ

Мы павінны адзначыць і далатныя бакі інсцэніроўкі. А. Струніну знайшоў удалы і самастойны «эквівалент» экспазіцыйнай сцэне апавядання, напісаўшы замест кінематаграфічнага артылерыйскага абстрэлу сцэнічную карціну баявога адыходу чырвоных з гарадка. Смерць чырвонаармейца, фігура пажылой жанчыны над ім—эпізоды ўражлівыя, моцныя. Пралог спектакля (Семянухін на фоне чырвонага палотнішча зачытвае радкі пасмяротных запісак Арлова) таксама спрыяе належнаму гучанню твора. І, нарэшце, найбольш істотнай дадумкай рэжысёра з'явіўся вынас пытання аб партыйнай прыналежнасці Арлова пасля яго арышту на пасяджэнне рэўкома. У гэтай сцэне, праўда, ёсць недакладнасці, яна шмат траціць ад невыразнай і прымусовай мізансцэніроўкі. Аднак найбольш істотна іншае: лёс чалавека вырашаецца не адным голасам кіраўніка, а цэлай арганізацыяй яго паплечнікаў-рэвалюцыянераў.

Мы, на жаль, не маем інсцэніроўкі апавядання Б. Лаўранёва, створанай у 1926 годзе ў студыі Ю. А. Завадскага студыйцамі М. Чысцяковым, В. Балюнасам і С. Прэабражэнскім. Аднак літаратура аб тым спектаклі, іканаграфічныя матэрыялы, калі іх параўнаць з гродзенскай пастаноўкай, сведчаць, што ў Гродна не паўтаралі зробленага раней. Іншая справа, наколькі мэтазгодна было ва ўмовах Гродна нанава ўзорваць «цаліну». Але пра гэта можна меркаваць праз параўнанне дзвюх інсцэніровак, а мы пазбаўлены такой магчымасці. Адзначым толькі, што інсцэніроўка А. Струніна—крок наперад у параўнанні з экранізацыяй апавядання Лаўранёва, якая існавала ў трыццатыя гады пад назвай «Ляон Кушор'е» (гэта быў даволі прымітыўны дэтэктыў). Шмат пераваг у гродзенскім спектаклі і перад тэлепастаноўкай «Простай рэчы», якую не так даўно трансліравала Цэнтральнае тэлебачанне (у ёй занадта адчуваўся ўхіл да «дастаеўшчыны», а дыялог Арлова з Сабалеўскім у «Алімпе» выглядаў ні больш, ні менш як перафразам інтэлектуальнага паядынку Раскольнікава са следчым Парфірыем Пятровічам).

КОНКУРС «ПІЯНЕРА БЕЛАРУСІ»

Рэдакцыя газеты «Піянер Беларусі» аб'явіла конкурс на лепшае апавяданне з піянерскага жыцця. Конкурсныя творы павінны расказаць аб піянерскай дружбе і ўзаемавыручцы, аб сумленнасці і праўдзівасці, аб непрымірымасці да недахопаў. Героямі іх павінны быць піянеры 60-х гадоў—разведчыкі цікавых спраў, дапытлівыя, кемлівыя, ініцыятыўныя.

У конкурсе могуць прыняць удзел пісьменнікі, журналісты, настаўнікі, камсамольскія і піянерскія работнікі і іншыя.

Памер апавяданняў — да 8 старонак машынапісу.

Вынікі конкурсу будуць падведзены 2-га кастрычніка 1965 года. За лепшыя творы ўстанаўліваюцца прэміі: першая — 100 рублёў, дзве другія — па 60 рублёў, дзве трэція — па 40 рублёў.

САМАБЫТНАЕ ЎМЕЛЬСТВА

стэндз
калькі работ
кілімаў ды палаві
вешаных па сценах,
і ўсё, што бачыш, нах
шы выстаўку польскай прыкладной народнай творчасці.

Выстаўка арганізавана ў Мінскім Доме народнай творчасці Беларускім таварыствам дружбы і культурных сувязі з замежнымі краінамі.

Але расчараванне ад паразнальна невялікай колькасці экспанатаў хутка знікае — варта толькі больш пільна прыгледзецца да гэтых самабытных, арыгінальных твораў народных умельцаў Польшчы. Адразу ўваходзіш у свет нейкай адметнай сялянскай прастаты, заснаванай на глыбокіх традыцыях, на тонкім, выхаваным стагоддзямі гусце народа.

Яні прывабны шарсцяны ловіцкі хвартух! Здаецца, надзень яго — і настрой у цябе стане святочны, незвычайны. Для святочнага ўпрыгожання памяшканняў, паўна, прызначаны і народныя выразкі з каляровай паперы — райскія курпёўсія і ловіцкія птушкі, ловіцкія кветкі (так званыя кодры). Мы бачым у гэтых работах вялізную прагу творчасці, уменне выкарыстоўваць матэрыял.

За кожным, самым, здавалася б, нязначным экспанатам на дзіва выразна адчуваецца рэальнае жыццё народа, яго мастацкае майстэрства, фантазія.

Вось цэлая серыя драўляных мініяцюр. Умелы падбор разнастайных парод дрэва, своеасаблівая стылізацыя — і перад намі касец, пасядзелка, жанчына над калыскай, прачка, жанчына і гусі, папрадуха — гэта як бы фрагменты з жыцця народа. А калі глядзіш на гуральскія дубовыя чарпакі, лыжачніка з лыжкамі, даёнку, посуд для вады (абонька), — міжволі думаеш, што іменна яны, гэтыя касцы і папрадухі, зрабілі такія добрыя, прыгожыя, зручныя прадметы побыту. Уяўляеш, як «Курпёўскі пастух» (разьба па дрэву), якога мы бачым на выстаўцы, у вольныя ад работы гадзіны пляце з ранітавага вецця наўшы для рыбы. А талерка, сплеценая з гнутніх светлых карэнняў сасны, вельмі простая па форме, цудоўна глядзіцца і можа быць скарыстана ў побыце, а таксама можа ўпрыгожыць сучасны інтэр'ер.

Саломка — даступны і пашыраны ў Польшчы матэрыял — выкарыстоўваецца народнымі ўмельцамі для вырабу арыгінальных цыновак, — лёгкіх і прыгожых. Добра глядзіцца і вялікае дэкаратыўнае блюда з саломы.

Усё могуць умелыя рукі. Бурштыновыя зерні кукурузы, цвёрдыя і бліскучыя, — цудоўны матэрыял для пацеркаў. А побач — падфарбаваныя, трошкі адшліфаваныя і ўмела падабраныя пазванкі рыб, нанізаныя на нітку, утвараюць каралі, якія не адмовіцца надзець любая модніца. Такія каралі дапоўняць яркі святочны ўбор (дарачы, народныя гуральскія, кранаўскія, ловіцкія ўборы мы можам пабачыць на ляльках, традыцыйных і стылізаваных, якія экспануюцца на выстаўцы). Тут і адмысловыя выдумшкі — яйкі, абклееныя шарсцю і мякішам курпёўскага трыснягу, каляровай папераю. Тут і жывецкія папугаі з паперы (нешта нашталт пап'е-машэ). Усё гэта бліскучыя ўзоры невычарпальнай народнай фантазіі.

Цікавыя і гуральскія лубачныя карціны на шкле. Гэта расказы-сцэнкі з народнага жыцця ў мінулым.

Простыя па форме, трошкі арнаментаваныя керамічныя кубкі, беластоцкія сівані, ланцыцуцкія пернічнікі захоўваюць прынцыпы старадаўняга сялянскага роспісу польскіх керамічных рамёстваў. Яны досыць сучасныя і цікава упішуцца ў любы інтэр'ер.

Радаснае пачуццё не пакідае, калі знаёмішся з усім гэтым самабытным, традыцыйным умельствам нашых польскіх сяброў і суседзяў. Іх мастацтва, безумоўна, вельмі зразумелае і блізкае па характару да мастацтва нашых беларускіх народных умельцаў.

Б. ЛОБАН.

Народная фігурка

«Жанчына з ручным млынам»



«Жанчына і гусі»

МАЛАДОЕ ПАКАЛЕННЕ ПРЭМ'ЕРАЎ

МАЙСТРЫ ЭСТРАДНАГА МАСТАЦТВА

Калі ўважліва прыгледзецца да працэсаў, якія адбываюцца на сённяшняй савецкай эстрадзе, дык, бадай, перш за ўсё трэба адзначыць актыўнае вылучэнне артыстаў сярэдняга і маладога пакаленняў. Гэта не значыць, што «старыя» здалі свае пазіцыі. Яны працягваюць выступаць, рыхтуюць новыя праграмы, застаюцца любімцамі публікі. Але побач з праслаўленымі эстраднымі карыфеямі ўпэўнена сталі тыя, што яшчэ некалькі гадоў назад лічыліся пачынаючымі, падавалі надзеі, мелі перспектывы. Асабліва гэта прыкметна ў такіх цяжкіх эстрадных жанрах, як вакальны і так званы размоўны, які аб'ядноўвае канферансье, куплетыстаў, расказчыкаў, фельетаністаў.

Але калі на эстрадзе ўмацоўваецца новае пакаленне прэм'ераў, дык якія ж іх мастацкія тэндэнцыі?

У нас даволі доўга і, трэба сказаць, бясплодна спрачаліся аб спеваках, якія выкарыстоўваюць для ўзмацнення гуку мікрафон. Былі крытыкі, якія лічылі, што такое спяванне знаходзіцца па-за традыцыяй рускай пеўчай школы і што трэба проста забараніць карыстацца на эстрадзе любымі сродкамі тэхнікі. Так, радыё прыйшло на канцэрты не больш трыццаці гадоў назад. Але сам прынцып паўспявання, паўдэкламацыі пад музыку быў вядомы даўно, і ім карысталіся многія выдатныя артысты, асабліва пры выкананні вадэвільных куплетаў.

Мікрафон дае магчымасць уносіць у спяванне большую інтымнасць, дзякуючы яму можна з асаблівай выразнасцю данесці да слухачоў асобную фразу і нават слова. Але, натуральна, мікрафон зусім не адмяняе патрабаванняў высокай музычнасці, пачуцця верша, сапраўднай вакальнай культуры. Іменна гэтымі артыстычнымі якасцямі валодаюць многія эстрадныя спевакі — такія, як Эміль Гаравец, Гелена Веліканава, Мая Крысталінская, Эдзіта П'еха, Юлія Пашкоўская. Яны спрабуюць данесці да слухача перш за ўсё музычны вобраз песні, глыбіню пачуцця, у ёй закладзеныя.

Гаворачы пра рэпертуар пералічаных артыстаў, трэба адзначыць, што яны імкнуцца да грамадзянскай лірыкі. На эстрадзе спяваюць, вядома, і пра любоў — да дзяўчыны, да мужа, да маці, да дзяцей. У гэтых песнях гучаць высокія і чыстыя пачуцці, а не пустая сентыментальнасць.

На сённяшняй эстрадзе ўсё часцей можна пачуць рускія песні. Такія папулярныя спевакі, як Людміла Зыкіна, Іван Суржыкаў, Тамара Стралкова і многія іншыя, выконваюць іх па-майстэрску. І вось што яшчэ характэрна: сучасныя рускія мелодыі нясуць у сабе інтанацыі маладзёжных песень, гарадскога раманса. Гэтыя песні адначасова і народныя, і сучасныя — у гэтым іх сіла.

Гаворачы пра вартасці нашай вакальнай эстрады, нельга ў той жа час не заўважыць і яе слабасцей. Перш за ўсё вакальнае мастацтва, прадстаўленае на эстрадзе, усё ж недастаткова разнастайнае. Часам сустракаюцца спевакі, якім не хапае кантылены, гэта значыць умення паказаць харастро і своеасаблівасць голасу, напоўніць мелодыю пачуццём і зместам. Тыя прынцыпы, якія сцвярджаліся іменна ў эстрадным музыцы выдатным савецкім кампазітарам Ісаакам Дунаеўскім, прынцыпы шырокай напеўнасці, у некаторай меры губляюцца. У нас многа, так сказаць, расказчыкаў пад музыку — таленавітых, яркіх і своеасаблівых. Але яўна не хапае сапраўдных вакалістаў, якія выконваюць песню па ўсіх законах пеўчага майстэрства. І гэта збядняе эстрадны рэпертуар, збядняе самі канцэрты.

У нашай прэсе справядліва ўказвалася, што некаторыя савецкія выканаўцы недастаткова паглыблена працуюць над песнямі. У многіх артыстаў добры голас, выйгрышная знешнасць, зайздроснае ўменне амаль з ліста выконваць песню, што дазваляе ім часта змяняць рэпертуар. І ўсё гэта прыносіць поспех. Але часам спевакі не дабіваюцца раскрыцця вакальнага твора ва ўсёй яго лірычнай і псіхалагічнай сутнасці.

Зусім іншае ўражанне ад спявання папулярнай савецкай артысткі Клаўдзіі Шульжэнкі. Напрыклад, песня Аляксандра Цфасмана «Тры вальсы» ў яе выкананні ператвараецца ў сапраўдны эстрадны шэдэўр, таму што артыстка і голасам і ігрой на працягу некалькіх мінут раскрывае цэлае чалавечае жыццё. Вось такога майстэрства многім маладым выканаўцам не хапае.

Цяпер некалькі слоў пра артыстаў размоўнага жанру. Аляксандр Ліўшыц і Аляксандр Левенбук стварылі своеасаблівы сінхронна-размоўны дуэт. Яны вельмі старанна адбіраюць рэпертуар, шукаюць разумныя, вострыя і надзённыя нумары. Іх мацнейшы выразны сродак — іронія, і яна балюча абпальвае тых, каго кранаецца. Артысты амаль не прыбягаюць да дыдактыкі, да рыторыкі. Раскрыццём самой сутнасці верша або фельетона яны абараняюць адно і накідваюцца на другое. Моўная культура ў Ліўшыца і Левенбука знаходзіцца на вельмі высокім узроўні, іх інтанацыйныя пераходы бездакорныя, адной фразай яны ўмеюць намаляваць цэлую карціну.

Выдатна выконвае вакальныя народы любімая публікай артыстка Кіра Смірнова. Іншыя так званыя «парадысты» падмячаюць характэрную рысу папулярнага артыста і на гэтым спекулююць. Яны не столькі парадзіруюць, колькі папросту пераймаюць, робячы гэта і вульгарна і павярхоўна. У выступленнях Смірновай мы бачым выкрыванне штампаў, пошласці, адкрытай ігры на публіку, гэта значыць усяго таго, што перашкаджае мастацтву, раз'ядае яго. Народы дапамагаюць нам, як праз павелічальнае шкло, убачыць тыя недахопы, якія ёсць у розных галінах тэатральнага і эстраднага мастацтва.

З ліку адносна маладых канферансье трое дабіліся найбольш шырокага прызнання гледачоў. Гэта Барыс Бруноў, Эміль Радаў і Алег Міляўскі. Яны падобныя адзін на аднаго — і розныя. Падобныя таму, што ўсе трое клапоцяцца аб сучаснасці сваіх жартаў, аб іх надзённасці, сатырычным запале. Яны ўмеюць не толькі смяяцца, але, асабліва ў маналогах, добра сказаць пра тое значнае, што адбываецца ў нашым жыцці. Нарэшце, усе трое дамагаюцца ўстанаўлення паміж сцэнай і залай сапраўды інтэлігентных, даверлівых адносін. Гэта добра выхаваныя людзі гутараць са сваімі гасцямі-гледачамі, упрыгожваючы гэтую гутарку свежымі і дасціпнымі жартамі. Прычым Бруноў, бадай, самы вясёлы з іх, у яго ёсць нешта ад выдумшчыка, ён іншы раз любіць выкінуць амаль цыркавы фартэль. Радаў — больш стрыманы, разважлівы. Ён толькі расказвае, імкнучыся да «аб'ектыўнасці», але ў яго расказах заўсёды заключан смехавы зарад, і ў патрэбны момант ён узрываецца ў зале. Міляўскі падае жарты амаль лірычна, усміхаючыся толькі злёгку, кутакамі губ. Слухаеш яго — і разумееш, што ў гэтым, амаль заўсёды разумным жарце — вялікая доля праўды.

Працэс сцвярджэння новага ідзе, так сказаць, ва ўсіх «частках і злучэннях» вялікай арміі эстрадных артыстаў. І гэта новае добра прымаецца маладой публікай — галоўнай наведвальніцай эстрадных канцэртаў.

Юрый ДЗМІТРЫЕЎ,
доктар мастацтвазнаўчых навук.
(АДН).

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Прэм'ера казкі «Іван-ды-Мар'я» В. Гольдфельда паказаў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага. Рэжысёр спектакля — В. Багалюбскі. Мастак — Ю. Тур. Танцы ў пастаноўцы М. Расшчэпкіна.

У спектаклі заняты артысты Е. Бірукова, Г. Значкоўская, Б. Масуман, В. Мароз, Ю. Біруля, Т. Кудраўцава, В. Захарава, З. Асмолава, І. Жараў, І. Камароў, І. Пятроў, В. Палікцеў, Л. Рогава, Т. Каваляёва.

У сцэне са спектакля на здымку вы бачыце (злева направа) З. Асмолаву (Дар'я), Б. Масуман (Машанька), Ю. Бірулю (Багдашка).

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача паказаў днямі прэм'еру спектакля па п'есе польскага драматурга Тадэвуша Канцушніка «Любіць—не любіць».

У спектаклі заняты артысты К. Карлёва, Л. Барташэвіч, Л. Цімафеева, Л. Бельская, Г. Ваўчок, Ул. Драбышэўскі, Ю. Пашкін. Пастаноўка народнага артыста СССР П. Малчанава. Мастак І. Пешкур.

Тэксты песень да спектакля напісаў А. Вольскі. Музыка Б. Фёдарава. Танцы ў пастаноўцы В. Ахрэма.

На здымку — сцэна са спектакля, у якой заняты артысты Л. Бельская (Вяслава) і Ул. Драбышэўскі (Мечыслаў Альха).

СТАРОНКА З БІЯГРАФІІ ПІСЬМЕННІКА

ПОШУКІ, ЗНАХОДКІ

Цікавую дэталь біяграфіі А. М. Горкага знайшоў літаратуразнаўца Раман Вуль.

У 1902 годзе вядомаму рускаму хірургу прафесару Аляксандру Баброву ўдалося адкрыць у Алупцы першы на Паўднёвым беразе Крыма дзіцячы санаторый для кліматычнага лячэння коснага туберкулёзу. Ён павінен быў існаваць на прыватныя ўзносы. Было створана таварыства санаторыя, якое затым увайшло ў склад Усерасійскага імператарскага чалавекалюбівага таварыства.

Вясной наступнага года А. М. Горкі адпраўваў у Ялце. Жыў ён у свайго сябра ўрача Аляксандра Алексіна, аднаго з арганізатараў дзіцячага санаторыя. Па запрашэнню Алексіна пісьменнік аглядзеў новую здраўніцу, быў у захапленні ад выдатнага пачыну і тут жа ўнёс 600 рублёў — кошт гадавога ўтрымання аднаго хворага дзіцяці. Абяцаў дапамагаць санаторыю і ў далейшым.

Наколькі значнай была падтрымка Горкага, можна меркаваць па тым, што штогадовы ўзнос паступаючых у таварыства складаў 10, а пажыццёвы адначасовы — 100 рублёў.

7 верасня 1903 года першы гадавы сход таварыства аднагалосна абраў пісьменніка ганаровым членам. Такога гонару ўдастоіліся тады 3—4 кандыдаты, якія таксама ўнеслі буйныя сумы.

Але рашэнне сходу павінен быў зацвердзіць галоўны апякун таварыства мітрапаліт Антоній. Духоўнаму ж саноўніку здалося кашчунствам, што ў складзе імператарскага, няхай нават «чалавекалюбівага» таварыства можа аказацца пісьменнік-бунтар, і ён катэгарычна запратэставаў.

Паміж Алупкай і Пецярбургам завязалася доўгая перапіска. Памочнік апекуна запрасіў: «Якія асаблівыя заслугі А. М. Пешкава (сапраўднае прозвішча Горкага), з-за якіх ён мог бы быць зацверджаны ганаровым членам згодна з параграфам 12 статута таварыства санаторыя?»

Праўленне адказала: «Ён унёс буйную суму» і, апрача таго, «удзел і спачуванне яго як чалавека, які карыстаецца еўрапейскай вядомасцю, несумненна будзе мець добры ўплыў на развіццё дарагой нам установы».

На гэта суха адказалі, што апякун «не прызнаў магчымым задаволіць хадайніцтва праўлення, як непадыходзячае пад патрабаванне статута».

Праўленне алупкінскага аддзялення таварыства, лічачы, што яно можа само вызначаць, хто заслугоўвае абрання ў ганаровыя члены, апратэставала ў студзені 1904 года рашэнне мітрапаліта і звярнулася за падтрымкай у савет таварыства.

У маі таго ж года Горкі перадаў санаторыю чарговы ўзнос — тысячу рублёў. Гэта сума лішні раз пацвярджала, што ў асобе пісьменніка хворыя дзеці маюць вернага і жаданага сябра, сапраўднага чалавекалюбца. Але цемрашалаў-заправіл імператарскага таварыства нічым нельга было пераканаць. Горкі так і не быў зацверджаны ганаровым членам.

Сяргей ШАНТЫР.
(АДН).

КЛУБЫ ВІЯЛАНЧЭЛІСТАЎ

Нядаўна ў Маскве пры Цэнтральным Доме работнікаў мастацтва адкрыўся клуб віяланчэлістаў. Следам за масквічамі такі ж клуб стварылі ў сябе ленінградцы. «Наш клуб, — сказаў вядомы савецкі музыкант Мсціслаў Растраповіч, — аб'яднае не толькі прафесіяналаў, але і аматараў, не толькі дарослых, але і таленавітых дзяцей. У Ленінградзе ствараюцца тры віяланчэльныя аркестры».

Новы клуб атрымаў прывітанні ад выдатных музычных дзеячоў розных краін, у тым ліку ад Ігара Стравінскага і Ісаака Стэрна (ЗША), Герберта фон Караяна (Італія), французскага акцёра Марселя Марсо і многіх іншых. Добрыя пажаданні клубу прыслалі Дзмітрый Шастаковіч, Давід Ойстрах, Леанід Коган, Галіна Уланава.

АДН.

ТЫСЯЧА АЎТАРАЎ

ЗБОРЫ МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Цяжка назваць рэспубліку або вобласць Савецкай краіны, дзе б не было каштоўных збораў музычнага фальклору. Найбольш буйныя з іх знаходзяцца ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Тарту, Вільнюсе, Ташкенце.

Скарбы народнай музычнай творчасці пастаянна памнажаюцца намаганнямі энтузіястаў: музыкантаў - фалькларыстаў, педагогаў, студэнтаў, збіральнікаў-аматараў. Паволжа, Закарпацце, Украіна, Беларусь, Варонежская, Курская, Смаленская вобласці, вёскі рэспублік Прыбалтыкі, Туркменіі, раёны Грузіі, паўночныя раёны краіны — такая геаграфія фальклорных экспедыцый, якія арганізоўваюцца кансерваторыямі, інстытутамі Акадэміі навук, саюзамі кампазітараў.

У выніку з'яўляюцца зборнікі песень, навуковыя даследаванні. Яны дапамагаюць прапагандзе народнай творчасці, узбагачаюць кампазітараў тэмамі для твораў. Такія зборы сведчаць аб жыццёвасці старадаўніх класічных песень, якія шырока бытуюць і цяпер, а галоўнае, расказваюць пра новыя мелодыі, што складаюцца ў наш час. Натуральна, што новыя сацыяльныя ўмовы наклалі свой адбітак на змест і формы фальклору, які адлюстроўвае сучасную савецкую рэчаіснасць. Песні рэвалюцыйныя, партызанскія, першых пяцігодак, Вялікай Айчыннай вайны, песні лірычныя, жартоўныя — усе яны рознабакова прадстаўляюць свет пачуццяў савецкіх людзей. Нярэдка і творы прафесіянальных кампазітараў спяваюцца як «свае», з'яўляюцца іх розныя варыянты. Так было з лепшымі мелодыямі першых гадоў рэвалюцыі, творамі Уладзіміра Захарава, Дзмітрыя Пакраса, Ісаака Дунаеўскага, Васілія Салаўёва-Сядога, Мацвея Блантара і іншых. Узнікае моцная садружнасць прафесіянальнай і народнай творчасці.

Перад намі зборнік напеваў, запісаных А. Рудневай у Курскай вобласці. Многія з іх выконваюцца цяпер хорам у першапачатковым выглядзе. Мастацкая каштоўнасць зборніка велізарная. Лаўрэат Ленінскай прэміі, кампазітар Георгій Свірыдаў па матывах курскіх песень напісаў выдатную харавую сюіту — адзін з лепшых сучасных твораў гэтага жанру.

Многа гадоў заняты зборам і вывучэннем рускай народнай інструментальнай музыкі Б. Смірноў. Ён аўтар зборніка, прысвечанага гарманістам, уладзімірскім ражачнікам, народным скрыпачам. Яго запісы раскрылі цэлы свет цудоўных мелодый, якія паслужылі асновай для раду твораў савецкіх кампазітараў. Некаторыя ўзоры запісаны на грампласцінкі.

Як жывыя сведчанні гераізму і мужнасці савецкіх людзей захаваліся ў памяці народа песні рэвалюцыі. Першае шырокае выданне гэтых гераічных старонак гісторыі Е. Гіпіус і П. Шыраева суправадзілі даследаваннем, у якім раскрыты лёс самых вядомых песень, іх сувязі з традыцыямі такіх жа песень на Захадзе.

Незвычайна своеасаблівыя і выразныя мелодыі таленавітай народнай песеннліцы Аграфены Аленічавай (Омская вобласць). Іх тэмы — калгасная праца, савецкая Сібір, Радзіма. Пасля выдання зборніка гэтыя напевы сталі добра вядомыя, даволі часта выконваюцца хорамі краіны.

Любімы народам песенны жанр частушкі вельмі шырока прадстаўлен у калгасным і рабочым быце. Цудоўныя кароценькія запеўкі запісаны і апублікаваны ў розных раёнах краіны В. Левашовым, Н. Коцікавай, А. Мядзведзевым, В. Бокавым, А. Абрамскім. Яскравы іх каларыт паслужыў асновай для твораў некаторых кампазітараў. У першую чаргу тут трэба назваць оперу «Не толькі любоў» і «Гарэлівыя частушкі» для сімфанічнага аркестра Радзіёна Шчадрына.

Вывучэнне вуснай творчасці ідзе на ўсім зямным шары. Кожная нацыя ганарыцца непаўторнымі, арыгінальнымі творамі свайго народнага генія. Нядаўна, летам 1964 года, у Маскве працаваў Міжнародны кангрэс антраполагаў і этнографаў. Вучоныя многіх краін свету падзяліліся вопытам вывучэння музычнага фальклору і высока ацанілі дасягненні савецкіх даследчыкаў і збіральнікаў.

Сяргей АКСЮК,
кампазітар (АДН).

ПАМЯЦІ Ул. А. ФАВОРСКАГА



Савецкае мастацтва панесла цяжкую страту. Памёр вялікі мастак і цудоўны чалавек Уладзімір Андрэевіч Фаворскі. З яго імем звязана на працягу многіх дзесяцігоддзяў развіццё і станаўленне савецкай графічнай школы.

Мастацтва Фаворскага — здабытак не толькі савецкага народа, але і ўсёй сусветнай культуры.

Яркі талент Фаворскага — ілюстратара несмяротных твораў сусветнай класікі — з'явіўся бліскучым дапаўненнем вялікага мастака да тварэнняў вялікіх пісьменнікаў Дантэ, Шэкспіра, Гётэ, Пушкіна, Гогаля, Бальзака, Франса, Гюго, Мерыме, Бёрнса, Лермантава, Дзікенса, Крылова, Талстога.

Рэдкі каштоўны дар глыбокага мастацкага пранікнення ў творы вялікіх майстроў слова, выключная чуласць да ўсяго самабытнага дазвалялі Фаворскаму узнімацца ў сваёй творчасці на недасягальную вышыню вялікіх тварэнняў, пранікаць у самую іх сутнасць.

Фаворскі — адзін з тых шчаслівых мастакоў, якім дадзена лёгка і свабодна ўваходзіць у складаны свет твораў вялікіх пісьменнікаў, выступаць у іх сваім мастацтвам ілюстратара, як роўны з роўным.

Есць мастакі, чыя творчасць бывае горача прынята аднымі і зусім не зразумелая іншым. Творчасць жа Фаворскага захапляе кожнага, хто з ёй судакранаецца. Гэтая творчасць не перастае затым захапляць чалавека, застаецца яго радасцю на ўсё жыццё.

Тыя, каму пашчасціла жыць і працаваць побач з Уладзімірам Андрэевічам або проста сустракацца з ім, ніколі не забудуць гэтага чулага, абаяльнага, гатовага заўсёды дапамагчы, і ў вялікім і ў малым, і зусім бескарыслівага чалавека. Цяжка назваць яшчэ адно імя чалавека, у якім бы так шчасліва спалучаліся выключная адукаванасць і вялікая культура, прастата і мудрасць, вялізны талент мастака і палымянае сэрца грамадзяніна.

Творчасць Фаворскага — яшчэ адна яркая ўспышка народнага генія.

А. АЛАДАВА,
дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

У БРАТНЯЙ ЮГАСЛАВІІ

КОЖНЫ ПЯТЫ ВУЧЫЦЦА

У Югаславіі налічваецца цяпер каля 15 тысяч пачатковых, многа тысяч сярэдніх школ, амаль 260 вышэйшых навучальных устаноў. З кожным годам пашыраецца сістэма завочнай адукацыі. Усяго рознымі відамі навучання ахоплена 18 працэнтаў насельніцтва. Іншымі словамі, кожны пяты югаслаў вучыцца. Каб зразумець усё значэнне гэтай лічбы, трэба ўспомніць, што да вайны больш чвэрткі насельніцтва краіны было непісьменнае.

РАСЦЕ КОЛЬКАСЦЬ БІБЛІЯТЭК

Хутка расце ў Югаславіі сетка бібліятэк. За апошнія 7 гадоў іх колькасць павялічылася больш чым у два разы. Цяпер у краіне налічваецца звыш 16 тысяч навуковых, школьных, спецыяльных бібліятэк.

ЗВЫШ 18 ТЫСЯЧ СПЕКТАКЛЯЎ

Сучасная Югаславія — краіна высокай тэатральнай культуры. Толькі ў Бялградзе адкрыта 5 буйных тэатраў, а ўсяго тут працуе звыш 50 прафесіянальных, больш за 100 самадзейных і 28 дзіцячых тэатраў. У 1963 годзе яны далі ўсе разам 18 тысяч спектакляў, а ў мінулым годзе яшчэ больш. Югаслаўскія тэатры наведваюць штогод 5 мільёнаў гледачоў.

ТЫРАЖ — 16 МІЛЬЁНАЎ ЭКЗЕМПЛЯРАЎ

Імёны многіх югаслаўскіх пісьменнікаў, такіх, напрыклад, як лаўрэат Нобелеўскай прэміі Іво Андрыч, Эрых Кош, Міраслаў Крлежа і іншыя, карыстаюцца шырокай вядомасцю не толькі ў Югаславіі, але і ў Савецкім Саюзе і ў многіх іншых краінах свету. За гады, якія прайшлі пасля вайны, у Югаславіі выдадзена больш за 2 тысячы розных літаратурных твораў, у тым ліку каля 700 раманаў. Агульны тыраж усіх гэтых выданняў перавышае 16 мільёнаў экземпляраў.

РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЕ — У БЫТ

Да вайны ў Югаславіі на 100 жыхароў прыпадаў адзін радыёпрыёмнік. Цяпер радыёпрыёмнік мае кожны восьмы жыхар краіны. Хутка павялічваецца і колькасць уладальнікаў тэлевізараў. У 1957 годзе ў краіне было зарэгістравана толькі 4 тысячы тэлевізараў. У мінулым годзе іх стала больш за 205 тысяч. Буйныя тэлевізійныя станцыі і студыі створаны цяпер, апрача Бялграда, у Загрэбе, Любляне, Сараеве і Скоплі.

СТВОРАНА БОЛЬШ ЗА 200 ФІЛЬМАЎ

Югаслаўская кінематаграфія — маладая: ёй няма яшчэ і 20 гадоў. Аднак многія кінакарціны, створаныя такімі буйнымі студыямі, як «Авала-фільм», «Застава-фільм», «Дунай-фільм», «Віба», «Босна-фільм», «Лоўчэн-фільм», карыстаюцца заслужанай папулярнасцю не толькі ў Югаславіі, але і за яе межамі. Усяго за гады, якія прайшлі пасля вызвалення краіны, на экраны выпушчана звыш 200 югаслаўскіх фільмаў. Цяпер кінапрадпрыемствы Югаславіі здымаюць штогод 20 мастацкіх і 250 кароткаметражных кінанарцін, прычым прыкладна 60 з іх экспартуюцца ў 50 краін свету.

Ю. КАРНІЛАЎ,
нарэспандэнт ТАСС.
Бялград.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

5 студзеня

Першая праграма. У дні школьных канікул. 12.00 — «Дзеці капітана Гранта». Мастацкі фільм. 16.25 — праграма перадач. 16.30 — для малышоў. «Аб чым расказала ёлка». 16.40 — «Тараканішча». Мультыплікацыйны фільм. 17.00 — «Сёння свята ў дзяцей». Трансляцыя навагодняга свята вучняў 3-х класаў 4-й мінскай школы. 17.30 — тэлевізійныя навіны. 17.55 — «Кіно і час». Перадача другая. Перадачу вядзе кандыдат мастацтвазнаўства Р. М. Ільін. 19.05 — заключны канцэрт фестывалю «Руская зіма». Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Кінаэкран, 65». Агляд (М).

Другая праграма. 12.00 — мастацкі фільм «Золушка» (М). 17.05 — праграма перадач (М). 17.10 — для малодшых школьнікаў. «Шкляны глобус». Перадача з Ленінграда. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 19.05 — «Нараджэнне гіганта». Дакументальны фільм. 19.25 — «Твой горад». Кінанарыс. 19.45 — «Ад Акшара да Масквы». Кінакансерт. 20.20 — «Паляўнічы з Удэге», «Пясняр народа». Кінанарысы.

6 студзеня

Першая праграма. У дні школьных канікул. 16.10 — праграма перадач. 16.15 — «Канёк-гарбунок». Спектакль Дзяржаўнага тэатра лялек БССР. 17.35 — «Дапамагла дружба». Кінанарыс. 17.45 — тэлевізійныя навіны. 18.10 — «Свет сёння» (М). 18.50 — «Кампазітар Р. Глізар». Да 90-годдзя з дня нараджэння (М). 19.00 — балет Р. Глізэра «Медны коннік». Спектакль Ленінградскага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Кірава. Перадача з Ленінграда. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.15 — «Свята рускага мастацтва». Перадача аб маючай адбыцца Дэкадзе рускага мастацтва ў Беларусі.

Другая праграма. У дні школьных канікул. 12.00 — мастацкі фільм «ВострАў скарбаў» (М). 17.20 — праграма перадач (М). 17.25 — для школьнікаў. «Піянерскі канцэрт» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Сказ аб Осіі Даблане». «Траса дружбы». Дакументальныя фільмы. 18.45 — «Музей-сядзіба Абрамцава». Навукова-папулярны фільм. 19.10 — «Подзвіг», «Я, «Казань», даю пеленг», «У снег і ў вецер». Кінанарысы. 20.05 — «Жывы чыгун», «Алтайскі лес». Навукова-папулярныя фільмы. 20.45 — «Кніга старога Вельмурада». Кароткаметражны фільм. 21.20 — «Вартавыя Балтыкі», «Вогненныя кветкі». Кінанарысы. 21.55 — «Сіні шлях». Дакументальны фільм. 22.15 — «У эфіры — «Маладосць». Прэм'ера тэлефільма «Вечны агонь» (М).

7 студзеня

Першая праграма. У дні школьных канікул. 16.00 — ёлачная прадстаўленне. Перадача з Крамля. 17.30 — «Піянерскі касцёр». Навагодні выпуск. Тэлечасопіс. 18.15 — тэлевізійныя навіны. 18.40 — «Мядзведзь». Кароткаметражны фільм. 19.30 — на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Перадача з Ленінграда. 21.30. «Эстафета навін» (М).

Другая праграма. У дні школьных канікул. 17.30 — для школьнікаў. «Сто задум двух сяброў» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Навука — вытворчасці». Тэлечасопіс (М). 18.40 — «Старонкі вашых пісьмаў». Музычная перадача (М). 19.30 — «Блакітныя жамчужыны». «Дзень майго нараджэння». Тэленарысы. 20.00 — «Машына 41-66». Дакументальны фільм. 20.20 — «Скачкамі лані». «Пермская мастацкая галерэя». Навукова - папулярныя фільмы. 21.00 — «Сакрэт НРВ». Кінанарыс.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУ
К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГА
А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. А
ВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага р
З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Праўленне Саюза мастакоў Беларусі з
ляе аб заўчаснай смерці члена Саюза
жывапісца ДЗЕНЬІЦА Валянціна Канстан
спачуванне сям'і нябожчыка.

«Літаратура і мастацтва» выход

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. ф
3-24-61, намесніка галоўнага рэдакта
3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-5
дзела культуры — 3-22-04, аддзела
6-25-19, бухгалтэрыі — 6-26-17.

«Литература и искусство» — о
и правления Союза писателей Б

Індэкс 63856, Друкарня